◂ № 33 (256) ◂ 9 верасня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ЛЕАНІД ЗЛОТНІКАЎ** Стар. 14–15

**ПОШУКІ БУДУЧЫНІ**
Арабскія рэвалюцыі і ўласнае, цяпер ужо не безагаворачна ўпэўненае становішча на палітычным алімпе спарадзіла ў беларускага лідара ідэю надаць Калектыўным сілам аператыўнага рэагавання АДКБ функцыю гаранта ўлады Стар. 4

**ЯК МЫ ВЫВУЧАЛІ ЗЯЛЁНУЮ КНІГУ**
Разам з крахам рэжыму Кадафі, здаецца, знік Рух рэвалюцыйных камітэтаў (РРК) — інтэрнацыянал аматараў «Зялёнай кнігі».
Нататкі заснавальніка беларускай секцыі РКК Стар. 11

**ТУТ ЖЫЎ І ПРАЦАВАЎ ЯКУБ КОЛАС** Стар. 15

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**АРТЫМОВІЧЫ**

Нарыс Сяргея Чыгрына

▸ З НАГОДЫ

## ДЗЯРЖАВА ПРОСІЦЬ

Вольга ХВОІН

**Высокія чыны заклікаюць беларускі народ аб'яднацца, зразумець і зняць кашулю, каб дапамагчы выбрацца з нэндзы. Але ці гатовыя грамадзяне выцягнуць і пакласці на дзяржаўны стол агучаныя кіраўніцтвам Беларусі сем мільярдаў долараў заначак?**




Для пачатку хацелася б прывесці вельмі паказальныя лічбы. Папулярны беларускі інтэрнэт-партал tut.by правёў апытанне на тэму «Я б з'ехаў з Беларусі...». З прапанаваных варыянтаў адказ «Як толькі з'явілася б магчымасць» абралі больш за 55% рэспандэнтаў. І толькі 14% прагаласавалі за варыянт «Я нікуды не збіраюся з'язджаць. Я цалкам шчаслівы тут».

Пра крах ідэі сацыяльнага кантракту, што актыўна абмяркоўвалася цягам апошніх гадоў палітыкамі і аналітыкамі, якія шукалі прычыну, чаму ж беларусы не ідуць грудзямі на барыкады рэвалюцыі, гэтым летам стала зразумела нават сціплым пенсіянерам і абыякавым спажыўцам пладова-ягаднага. І ўсё, што робіцца цягам апошніх месяцаў, працуе толькі на карысць размывання аўтарытэту і даверу да ўладаў. Быццам пятая калона, якую столькі гадоў чыхвосціў Аляксандр Лукашэнка, гэта і ёсць улада. Яна абяцае і не выконвае, патрабуе і пагражае.

Перад апошнімі прэзідэнцкімі выбарамі было абяцанне сярэдняга заробку ў пяцьсот долараў. І, чаго крывіць душой, многія яго мелі, а некаторыя нават больш. Але ж абяцанне было не на месяц і нават не на год, а на доўгую перспектыву. Усяго толькі праз паўгода заробкі ў многіх добра калі складаюць сто замежных у эквіваленце, а кошты і інфляцыя няспынна паўзуць уверх. Нават жарт з'явіўся для новых эканамічных умоў: «Распродаж па-беларуску — нашы цэны сёння на 30% ніжэй, чым заўтра!»

У такіх варунках Мінэканомікі ўжо не саромеецца і прагназуе інфляцыю за год большую за 100%. Як паведаміла «Інтэрфакс» крыніца з міністэрства, прадугледжана тры сцэнары развіцця макраэканамічнай сітуацыі, і ўсе яны прагназуюць інфляцыю, якую вымяраюць трохзначнымі лічбамі. Паводле прагнозаў, гэта прывядзе да падаражання імпарту, росту выдаткаў на сацыяльныя патрэбы, росту платы за жыллёва-камунальныя паслугі. Таксама прагназуюцца захады па ліквідацыі дыспарытэту цэнаў на тавары і прадукты, якія актыўна вывозяць у Расію (то бок цэны растуць і будуць расці далей). Нават афіцыйная статыстыка кажа, што інфляцыя ў Беларусі за студзень–чэрвень склала 41%.

Даражэюць прадукты, праезд у грамадскім транспарце, камунальныя паслугі, зноў з'яўляецца дэфіцыт тавараў. Людзі ў чэргах на кожнае неасцярожнае слова выдаюць песні жальбы на тэму, як жыць далей і чым карміць сем'і. Кіраўніцтву краіны варта прасіць калі не прабачэння, то хаця б паразумення. А яно ў старым рэчышчы: самі вінаватыя, то і расхлёбвайце!

«Усе даходы, звязаныя з ростам коштаў, накіраваць на меры сацыяльнай абароны. Гэта тычыцца як бюджэтных, так і камерцыйных арганізацый», — грымеў Лукашэнка на нарадзе па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця. Ён растлумачыў, што там, дзе ўтвараюцца звышпрыбыткі, яны павінны быць канфіскаваныя. «Бізнэс, прадпрыемствы, фізічныя асобы, якія паспяхова працуюць, павінны разумець, што цяпер дзяржаве трэба падставіць плячо, — настаўляў кіраўнік дзяржавы чыноўнікаў. — Ёсць залішні рост коштаў ва ўсіх сегментах эканомікі. Гэтыя сродкі павінны быць сабраныя ў адмысловы фонд і адпраўленыя ў дапамогу людзям. Перш за ўсё, шматдзетным сем'ям, малазабяспечаным і дзецям, у дзіцячыя садкі і школы, каб яны не засталіся без увагі, і перш за ўсё іх трэба накарміць і апрануць». Чаму ні слова не было згадана пра прэзідэнцкія фонды і магчымасць узяць крыху рэсурсу адтуль?

Адначасова з мерамі па выхаду на адзіны курс беларускага рубля плануюцца разавыя выплаты. «Для матэрыяльнай падтрымкі бюджэтнікаў будзе аказана дапамога ў памеры 500 тысяч рублёў, пры гэтым не павінны быць забытыя і работнікі рэальнага сектара», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Гэтыя меры мусяць быць рэалізаваныя ўжо ў верасні. Якім чынам, не зразумела. Зрэшты, і памер дапамогі асаблівага аптымізму не надае — гэта менш 60 долараў паводле рыначнага курсу.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава будзе працягваць індэксацыю выплат, будзе павышана тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. «Паралельным курсам павінны рухацца ўсе вытворчыя, камерцыйныя структуры, павышаючы даходы насельніцтва», — перакананы кіраўнік Беларусі. Так што прыватным прадпрыемствам трэба рыхтавацца — з іх спытаюць. Для аказання адраснай сацыяльнай дапамогі ў бюджэце прадугледжана каля 70 мільярдаў рублёў. Выглядае аптымістычна? То не будзем расстройвацца і прыводзіць для параўнання кошты на прадукты і прамысловыя тавары, пачакаем першых камунальных плацяжоў у новым ацяпляльным сезоне...

Што рабіць, апроч як аддаваць дзяржаве свае звышпрыбыткі, пакуль не зразумела. А вось хто вінаваты — вядома. Глабальны фінансава-эканамічны крызіс і алігархі з падкантрольнымі ім СМІ. Прынамсі такую версію агучыў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў у сваім звароце да жыхароў сталіцы: «Мы, дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, падзяляючы адказнасць за лёсы сваіх выбаршчыкаў, усіх мінчан і дзейнічаючы ў іх інтарэсах, звяртаемся да жыхароў сталіцы аб неабходнасці згуртавацца, аб'яднаць высілкі ўсіх у рэалізацыі намечаных прэзідэнтам, улады і кіраўніцтвам горада-героя мер па стабілізацыі эканамічнай сітуацыі і сацыяльнай падтрымкі насельніцтва. Цвёрда ўпэўненыя, што разам мы пераадолеем часовыя цяжкасці. Перакананыя, мінчане зробяць усё неабходнае для нарошчвання тэмпаў росту эканомікі і дабрабыту людзей. Сталіца нашай Радзімы, як і ўся рэспубліка, стане моцнай і квітнеючай!»

І хто адважыцца аспрэчыць аптымізм народных абраннікаў?

АКЦЫІ

# АПЛАДЫСМЕНТЫ ЗАГУЧАЦЬ ЗНОЎ

**Арганізацыі маўклівых акцый пратэсту спадзяюцца зладзіць другую хвалю мірнага выхаду на вуліцу беларусаў. Бліжэйшая дата — 21 верасня.**

Арганізатары «Рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі» заклікаюць 21 верасня а 19-й гадзіне збірацца на цэнтральных вуліцах гарадоў і проста прагульвацца. Сімволіка, лозунгі, патрабаванні зноў не знайшлі месца ў планах тых, хто заклікае людзей аб’ядноўвацца і выходзіць на вуліцы. Аднак арганізатары не забараняюць прыносіць на акцыю, напрыклад, сцягі і плакаты. «Але людзі мусяць быць гатовыя да таго, што іх могуць затрымаць, а таксама да таго, каб бараніць іншых ад невядомых бандытаў у цывільным», — гаворыць каардынатар ініцыятывы «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» Вячаслаў Дыянаў.

Ён таксама паведаміў, што бліжэй да дня правядзення акцыі будуць сфармуляваныя і агучаныя патрабаванні да ўладаў.

Ініцыятыва «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» падтрымлівае і Народны сход, што рыхтуецца правесці апазіцыя ў гарадах Беларусі 8 кастрычніка. У прыватнасці, абяцаюць інфармацыйную падтрымку, агітацыйныя медыйныя матэрыялы.

«З улікам апошніх сацыялагічных даследаванняў пратэстныя настроі цяпер вышэй, чым летам. Калі летам многія з’язджалі, то цяпер яны ў гарадах. Людзі проста на месцы. Ёсць прамая сувязь паміж пратэстнымі настроямі і колькасцю людзей на вуліцах, таму мяркую, што восенню вулічныя акцыі будуць масавымі», — зазначае Дыянаў.

ЗАКЛІК

# ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТВЯЗНЯЎ

**Чэшская няўрадавая арганізацыя «Свабодная Беларусь» патрабуе вызвалення беларускіх палітвязняў і павагі да правоў чалавека ў беларускіх турмах.**

Маладафронтаўскія партнёры — чэшская недзяржаўная арганізацыя «Svobodne Belorusko» («Свабодная Беларусь») ініцыявала адпраўку заклiку змагацца за вызваленне палітвязняў і павагу правоў чалавека ў беларускіх турмах. Зварот дасланы да міністра ўнутраных спраў Чэшскай Рэспублікі Яна Кубіцэга, міністра замежных справаў ЧР Карла Шварцэнберга, міністра юстыцыі ЧР Іржыго Паспішыла і прэм’ер-міністра Пётра Нечаса.

У тэксце заклiку паведамляецца: «Паважаны спадар прэм’ер-міністар, паважаныя міністры ўрада Чэшскай Рэспублікі, мы просім і заклікаем вас як прадстаўнікоў вышэйшага выканаўчага органа Чэшскай Рэспублікі, каб вы прасілі ад беларускага ўрада і сваіх беларускіх калегаў наступнае:

- Неадкладнае вызваленне ўсіх палітычных зняволеных.
- Захаванне беларускага заканадаўства і забеспячэнне яго выканання ў турмах.
- Павагу да правоў вязняў, замацаваных у беларускай прававой сістэме.
- Спыненне выкарыстання бессэнсоўных незаконных пакаранняў.
- Спыненне пераследу зняволеных і жорсткага абыходжання з імі.
- Забеспячэнне прафесійнай медыцынскай дапамогі і рэабілітацыі для Змітра Бандарэнкі».

Заклік тычыцца ўсіх палітвязняў. Ініцыятары звароту асабліва занепакоены станам Змітра Дашкевіча, Мікіты Ліхавіда і Змітра Бандарэнкі.

Заклік падтрымалі 22 чалавекі, сярод якіх некалькі пастараў пратэстанцкіх цэркваў, настаўнікаў, прадпрымальнік і пенсіянеры.

**Паводле інфармацыі «МФ»**

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# АГП СУПРАЦЬ

Генадзь КЕСНЕР

**На пасяджэнні Палітсавета Аб’яднанай грамадзянскай партыі, якое прайшло 7 верасня, адбылося абмеркаванне вынікаў візіту ў Варшаву старшыні партыі Анатоля Лябедзькі ў складзе дэлегацыі беларускай апазіцыі, а таксама эканамічнай і ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі. Пра вынікі пасяджэння кіраўнікі АГП распавялі журналістам адразу па яго завяршэнні.**

Закранаючы пытанне вынікаў візіту дэлегацыі беларускіх дэмакратычных палітыкаў у польскую сталіцу, Анатоль Лябедзька адзначыў, што сустрэча апазіцыянераў з прэм’ер-міністрам Польшчы Дональдам Тускам замест планаваных 30 хвілін доўжылася 1 гадзіну 15 хвілін, што сведчыць пра наяўнасць цікавасці ў польскага кіраўніцтва да беларускай праблематыкі. Лябедзька адзначыў, што пазіцыя беларускай дэлегацыі была ўзгодненай. «Польшча надзвычай зацікаўлена ў вяртанні Беларусі да дэмакратыі, яна гатова выконваць функцыю аднаго з галоўных лабістаў інтарэсаў прыхільнікаў перамен у Беларусі ў Еўрасаюзе. І Туск, і міністр замежных спраў Сікорскі падкрэслілі, што прамыя перамовы ўлады і апазіцыі — гэта правільны падыход, і гэта вельмі важна і істотна. У цэлым вынікамі візіту мы задаволеныя», — падкрэсліў старшыня АГП.

Анатоль Лябедзька нагадаў, што ў хуткім часе ў Варшаве мае адбыцца саміт Усходняга партнёрства. «Мы абмяркоўвалі прадстаўніцтва з беларускага боку, і сябры беларускай дэлегацыі адназначна выказаліся, што не можа быць запрашэння на саміт для Аляксандра Лукашэнкі. Разам з тым, мы выказалі меркаванне, што варта, каб нехта быў ад улады і выканаў функцыю паштальёна — атрымаў пасланне ад ЕС і перадаў яго ў Чырвоны дом. Прадстаўнікам апазіцыі таксама будзе прадстаўлена магчымасць прыехаць у Варшаву і прыняць удзел у шэрагу мерапрыемстваў, і нашы польскія калегі паабяцалі гэтаму садзейнічаць», — паведаміў палітык.

Што да ўнутранай сітуацыі ў Беларусі, то, па словах намесніка старшыні АГП Льва Марголіна, на пасяджэнні Палітсавета партыі прынята пастанова аб сітуацыі ў Беларусі і тых заходах, якія ўрад здзяйсняе па барацьбе з эканамічным крызісам. «Мы канстатуем, што гэтыя рашэнні вельмі запозненыя і палавінчатыя, што ўрад не разумее сітуацыю ў краіне і глыбінныя прычыны крызісу. Калі б урад у Беларусі нешта вырашаў, то можна было б ставіць пытанне пра яго адстаўку, але паколькі ўсю адказнасць за тое, што адбываецца ў дзяржаве, бярэ на сябе Лукашэнка, то на парадку дня ўзнікае пытанне аб адстаўцы менавіта яго», — заявіў Марголін.

Па словах намесніка старшыні АГП, Палітсавет пацвердзіў актыўны ўдзел партыйцаў у «Народных сходах», запланаваных на 8 кастрычніка. Што да так званага «круглага стала», які анансавала ўлада, то, як падкрэсліў Леў Марголін, павінны быць наўпроставыя перамовы паміж уладай і апазіцыяй, магчыма, пры пасярэдніцтве еўрапейскіх арганізацый. «Толькі прамыя перамовы і толькі пры ўмове вызвалення ўсіх палітвязняў», — адзначыў палітык.

ЗВАРОТ

# ЦЁПЛЫЯ СЛОВЫ ЗНЯВОЛЕНЫМ

**З нагоды Дня міжнароднай салідарнасці журналістаў Беларуская асацыяцыя журналістаў заклікала ўсіх яшчэ раз узгадаць пра тых, хто зараз за кратамі, і ў першую чаргу пра журналістаў.**

«8 верасня ў свеце адзначаецца Дзень міжнароднай салідарнасці журналістаў, — гаворыцца ў звароце. — Гэта добрая нагода для кожнага з нас узгадаць пра нашых калег і сябраў арганізацыі, якія сёння апынуліся ў няволі, — Дзмітрыя Бандарэнку, Паўла Севярынца, Алеся Бяляцкага, Аляксандра Атрошчанкава. І не проста ўзгадаць, але і асабіста выказаць сваю ўвагу і падтрымку тым, хто падпаў пад жорсткі ўціск і пераслед у звязку з падзеямі 19 снежня і іх наступствамі. Кожны з нас можа знайсці цёплыя словы і час на тое, каб адправіць зняволеным ліст альбо тэлеграму».

Адрасы вязняў:

**Дзмітрый Бандарэнка:**



213105, Бандарэнку Дзмітрыю Яўгенавічу, г. Магілёў, Слаўгарадская шаша, п/а Вейна, папраўчая калонія №15, каранцін

**Павел Севярынец:**



225140, Севярынцу Паўлу Канстанцінавічу, Пружанскі раён, Брэсцкая вобл., в. Куплін, папраўчая ўстанова адкрытага тыпу №7

**Алесь Бяляцкі:**



220030, Бяляцкаму Алесю Віктаравічу, г.Мінск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА-1

Нагадваем, што за Алеся Бяляцкага можна таксама падпісаць асабістае паручальніцтва http://spring96.org/be/news/44987

**Аляксандр Атрошчанкаў:**



211300, Атрошчанкаву Аляксандру Сяргеевічу, папраўчая калонія №3, пасёлак Віцьба, Віцебскі раён, Віцебская вобл.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ШЫЛУ ДАЛІ ЧАРГОВЫ ТЭРМІН

**Актывіста зарэгістраванай у Чэхіі грамадскай арганізацыі «Малады фронт» Івана Шылу Горацкі раённы суд пакараў адміністрацыйным арыштам на 20 сутак.**




Маладафронтавец прызнаны вінаватым за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце ля адміністрацыйнага будынка горацкай папраўчай калоніі № 9. Акрамя таго, ён, паводле выраку, аказаў супраціў міліцыі пры затрыманні.

Цяпер хлопец знаходзіцца ў Польшчы. Пра гэта паведаміў яго бацька Уладзімір. Паведамленне пра прысуд з Горацкага суда даслалі поштай.

Раней Іван Шыла пісьмова звяртаўся да суда, каб яму прызначылі пакаранне, не звязанае з пазбаўленнем волі, бо ён мае хваробу скуры. Ён таксама прасіў, каб справу разгледзелі без яго.

У папраўчай калоніі №9 адбывае двухгадовае пакаранне лідар «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч. 2 жніўня чатыры дзясяткі актывістаў наведаліся да кіраўніцтва турмы патрабаваць, каб яно дазволіла адвакату сустрэцца са зняволеным актывістам. Сярод іх быў і Іван Шыла. Пасля адмовы актывісты зладзілі пікет з расцяжкай «Спыніце пераслед». Акцыю пратэсту разагналі, пятнаццаць удзельнікаў затрымалі. 3 жніўня іх судзілі.

На судзе Іван Шыла запатрабаваў адваката, і яго адпусцілі. Вядома, што 8 жніўня адбудзецца разгляд яго справы. У судзе, аднак, праз тэлефон адмовіліся сказаць, які вырак яму вынеслі.

Нагадаем, за ўдзел у пікеце пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі ад 5 да 17 сутак 11 актывістаў. Аднаму далі штраф 30 базавых велічыняў, аднаго адпусцілі, не складаючы пратаколу.

**Паводле інфармацыі «МФ»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПАГРУЖЭННЕ Ў БАГНУ?

Сяргей САЛАЎЁЎ




**Здаецца, усе спробы беларускіх уладаў «пагандляваць» палітзняволенымі, зрабіць чарговую «лібералізацыю», пасадзіць за «круглы або квадратны» стол перамоваў беларускую апазіцыю, і пад усё гэта атрымаць грошы — праваліліся. Еўропа больш не верыць афіцыйнаму Мінску. Яна выстаўляе канкрэтныя і капітальныя ўмовы наконт таго, на якіх умовах гэтыя перамовы павінны праходзіць. І без выканання гэтых умоваў ніякага «дыялогу» не будзе — у тым ліку, хутчэй за ўсё, наконт крэдыту МВФ.**

У аўторак, 6 верасня, прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск і міністр замежных справаў Радаслаў Сікорскі абмеркавалі з дэлегацыяй беларускай апазіцыі сітуацыю ў Беларусі і шляхі яе змянення, уключаючы магчымасць арганізацыі дыялогу ўлады і апазіцыі. Раней некаторыя аналітыкі пісалі, што для Польшчы «круглы стол» — гэта нейкае магічнае словазлучэнне, бо іх рэвалюцыя таксама пачыналася з «круглага стала». І, нібыта, варта пачуць палякам гэтае словазлучэнне, як яны ўздымаюць лапкі ўгору і робяць усё, каб такія сталы шырыліся і мацнелі, не зважаючы на вынік.

Выявілася, што гэта зусім не так. Польшча больш прынцыповая, чым гэтага ад яе чакалі. «Польскі вопыт круглага стала сведчыць, што садзіцца і размаўляць можна толькі тады, калі вызвалены ўсе палітзняволеныя», — падкрэсліў Туск пасля заканчэння сустрэчы.

На перамовах размова ішла таксама аб міжнароднай дапамозе Беларусі. «Я заявіў аб сваёй поўнай прыхільнасці да таго, каб была аказана дапамога апазіцыі для арганізацыі дыялогу з уладамі, — сказаў польскі прэм'ер. — Мы гаварылі таксама аб гарантыях, якія можа даць Еўропа, каб гэты меркаваны дыялог паміж апазіцыяй і ўладай прынёс жаданыя вынікі, напрыклад, сапраўды свабодныя выбары ў парламент».

Туск таксама заявіў, што магчымая фінансавая дапамога Беларусі будзе залежаць ад зменненняў у краіне. «Не будзе фінансавай дапамогі рэжыму без радыкальных змяненняў, якія павінны абапірацца на вядзенне сур'ёзнага палітычнага дыялогу з апазіцыяй», — сказаў кіраўнік польскага ўрада.

Але больш балюча для беларускіх уладаў адгукнуўся двухдзённы саміт міністраў замежных спраў краін Еўрасаюза і дзяржаў-кандыдатаў на далучэнне да аб'яднанай Еўропы, што прайшоў у польскім Сопаце. У часе выніковай прэс-канферэнцыі пасля завяршэння нарады міністраў, вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан заявіла, што пазіцыя 27 краінаў-сябраў ЕС наконт Беларусі застаецца нязменнай. «Мы, канечне, адзначылі апошнія падзеі ў Беларусі — некаторыя заявы і захады, але паўтаруся, што мы патрабуем вызвалення і рэабілітацыі ўсіх палітычных зняволеных. Гэта была і ёсць наша пазіцыя. Пазіцыя, якой мы будзем цвёрда прытрымлівацца», — заявіла Эштан.

Трэба адзначыць тут адну фундаментальную рэч. ЕС патрабуе не толькі вызвалення палітвязняў, але і іх рэабілітацыі. То бок, Лукашэнка колькі заўгодна можа праяўляць «гуманнасць» і «велікадушнасць», вызваляючы палітычных апанентаў з турмаў. Але пакуль з іх судзімасці зняты не будуць, размаўляць няма пра што.

І не толькі з тых, што за кратамі. Сярод тых, хто павінны быць рэабілітаваны, — Уладзімір Някляеў, Ірына Халіп, Сяргей Марцалеў, Сяргей Вазняк, Аляксандр Фядута, Віталь Рымашэўскі, Наста Палажанка… Карацей, усе тыя, хто атрымаў пакаранне, але не звязанае з адпраўкай за краты. Што з імі рабіць будзем?

А калі рэабілітаваць усіх, то… Тыя, што былі за кратамі, будуць патрабаваць кампенсацыі маральнай і матэрыяльнай шкоды, шкоды, нанесенай іх здароўю і іх родным. От тады пойдуць працэсы, от тады пойдуць адстаўкі суддзяў, якія выносілі прысуды, і пракурораў, якія гэтыя прысуды абгрунтоўвалі!

Карацей, жорсткая пазіцыя Еўропы ў перыяд крызісу ў Беларусі яскрава паказвае, колькі гемарою самі сабе нарабілі беларускія ўлады з-за наяўнасці палітзняволеных.

Тым часам, як пелася ў адной песні, «эканоміка ў пралёце», і працягвае пралятаць ніжэй і ніжэй, пакуль зусім не ляснецца.

З адкрыццём у сярэдзіне верасня дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы (БВФБ) «адначасова практычна цалкам спыняюцца аперацыі на міжбанкаўскім валютным рынку», заявіў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Мікалай Лузгін.

Як растлумачыў прадстаўнік Нацбанка ў інтэрв'ю журналістам, фрагменты якога былі паказаныя па беларускіх тэлеканалах, такая мера скіравана на тое, каб усе здзелкі з замежнай валютай ажыццяўляліся на БВФБ па адзіным курсе на падставе попыту і прапановы. «Для таго, каб ён (курс на дадатковай сесіі — БелаПАН) не вельмі рэзка вырас у параўнанні з афіцыйным курсам, будуць зробленыя дадатковыя захады — зацісканне попыту на валюту і павелічэнне прапановы», — сказаў Лузгін.

З 1 чэрвеня Нацбанк поўнасцю спыніў ільготнае крэдытаванне, выдачу сродкаў на льготнае крэдытаванне. «Цяпер мы ажыццяўляем толькі стандартнае крэдытаванне камерцыйных банкаў для падтрымання функцыянавання плацежнай сістэмы», — сказаў ён.

Нацбанк не мае аніякіх механізмаў стабілізацыі курса рубля ці выхаду на адзіны курс, акрамя як «трымаць і не пушчаць». Забаранілі продаж валюты ад банка банку (міжбанкаўская біржа), валютай «з рук у рукі» займаецца міліцыя… Здаецца, хутка ва ўсіх, у каго гэтая валюта ёсць, яе будуць проста забіраць з тлумачэннямі кшталту «для выхаду на адзіны курс». Канешне, курс будзе адзіным, і нават, можа быць, «адзін да аднаго», калі валюты ўвогуле ні ў каго не застанецца.

Але ў сур'ёзных эканамістаў такія захады выклікаюць нават не ўсмешку — занепакоенасць. Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody's Investors Service чакае дэвальвацыі беларускага рубля да долара на 30–50% пасля частковай лібералізацыі курсу. Адпаведная пазіцыя экспертаў агенцтва Moody's утрымліваецца ў штотыднёвай справаздачы Weekly Crëedit Outlook.

Лібералізацыя валютнага курсу паступова прывядзе да паслаблення беларускага рубля да цяперашняга неафіцыйнага курсу, упэўнены ў Moody's. Як і ў выпадку з майскай дэвальвацыяй, лібералізацыя курсу разгоніць інфляцыю, якая і так блізкая да ацэнкі 50%, і павялічыць кошт абслугоўвання доўгу ў замежнай валюце, што прывядзе да росту долі крэдытаў у беларускіх банках, якія не абслугоўваюцца (таму дэвальвацыя аказвае негатыўны ўплыў на рэйтынгі банкаўскай сістэмы).

І апошняя рыска да ўсяго гэтага. У верасні павышаюцца гранічныя максімальныя адпускныя цэны на хлеб і малочныя прадукты на 5%. Вось такі ён, «беларускі цуд».

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНАТОЛЬ ЛЯЎКОВІЧ



Частка беларускіх сацыял-дэмакратаў на чале з Анатолем Ляўковічам гатовая сесці за стол перамоваў з уладай без якіх-небудзь умоў. Іх заява апублікавана 6 верасня ў газеце «Советская Белоруссия», друкаваным органе Адміністрацыі прэзідэнта. Пад заявай стаяць подпісы Анатоля Ляўковіча, Івана Анташкевіча, Анатоля Гнеўкі, Яўгенія Даўгаполава, Аляксандра Мікуліна, Аляксандра Падойніцына, Уладзіміра Ткачонка.

«Беларускае грамадства, — гаворыцца ў гэтым дакуменце, — сутыкнулася з сур'ёзнымі і небяспечнымі выклікамі фінансава-эканамічнага і сацыяльнага характару, абумоўленымі перш за ўсё глыбокім сусветным гаспадарчым крызісам і тымі палітычнымі працэсамі, якія ініцыююць вядучыя геапалітычныя акторы. Мы, сацыял-дэмакраты, якія стаяць на пазіцыях канструктыўнасці і палітычнай адказнасці за сучаснасць і будучыню краіны, падзяляем ідэю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі аб мэтазгоднасці развіцця дыялогу паміж суб'ектамі беларускага палітычнага працэсу, правядзення круглага стала па пытаннях антыкрызісных дзеянняў».

Ляўковіч узначальваў Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (Грамада) са жніўня 2008 года па кастрычнік 2010 года. Акурат у час абрання Ляўковіча на старшынства дзейны кіраўнік Грамады, экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін знаходзіўся ў турме. На з'ездзе 10 кастрычніка 2010 года кіраўніком партыі быў абраны Анатоль Сідарэвіч. Аднак Міністэрства юстыцыі прызнала гэты з'езд несапраўдным. 5 чэрвеня 2011 года прайшоў паўторны з'езд БСДП (Грамада), на якім кіраўніком партыі была абраная Ірына Вештард. Але і гэты з'езд Мінюст прызнаў нелегітымным.

### АЛЕСЬ КАМОЦКІ



Вядомы беларускі паэт і бард Алесь Камоцкі разглядае магчымасць стварэння ў будучыні музычнай групы. Паводле яго слоў, ён не ведае, калі дакладна збярэ неабходную колькасць музыкаў. Аптымальны склад групы, як сказаў выканаўца, — сем чалавек. Каб атрымаць суцэльны калектыў, акрамя самога Камоцкага, лічыць ён, у ім павінны быць два клавішнікі, басіст, гітарыст, барабаншчык і перкусіяніст.

«Гэта аптымальны склад, але я не ведаю, праз колькі гадоў я яго падбяру. Прычым я не проста кажу — два клавішнікі, а нават ведаю, хто і навошта», — адзначыў выканаўца. Ён дадаў, што адзін з іх — «бясспрэчна, Аляксандр Віслоўскі».

У апошні дзень лета Камоцкі адыграў канцэрт «Край жніўня» ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску. Назва канцэрту бярэ свае вытокі з кнігі-фотаальбома «Край», якую музыка разам з фатографам Вадзімам Грудзько стварыў у 2005 годзе. Гэтая кніга, як сказаў Камоцкі, — «знакавая, з яе пачался нейкая мая самастойная праца, і я пачаў рабіць свае кніжкі».

### ВЯЧАСЛАЎ ХАРАНЕКА



Новы рэкорд па падняццю цяжару ўстанавіў беларускі асілак Вячаслаў Харанека.

Выступаючы 4 верасня на Манежнай плошчы ў Маскве, ён зрабіў дзесяць кулянняў назад, утрымліваючы ў левай прамой руцэ 24-кілаграмовую гіру. Даўжыня «сілавы дарожкі» склала 13 метраў 40 сантыметраў. З кантрольным часам 3 хвіліны Харанека справіўся за 2 хвіліны 15 секунд. Па запрашэнні клуба «Інтэр-Стронг» асілак быў адным з удзельнікаў 16-га міжнароднага фестывалю рэкардсменаў Кнігі рэкордаў Гінеса, які прайшоў у расійскай сталіцы ў рамках Дня Масквы.

Папярэдні рэкорд Харанека ўстанавіў у 2006 годзе ў эфіры расійскай тэлепраграмы «Нашы рэкорды», якую вёў цяпер нябожчык расійскі асілак Уладзімір Турчынскі.

«Складанасць выступу на Манежнай плошчы была ў тым, што на размінку замест гадзіны я атрымаў толькі пяць хвілін, а тэмпература паветра была нізкай, — паведаміў БелаПАН Харанека. — Я турбаваўся за плячо і галаву, на якую ў красавіку пасля выбуху ў мінскім метро мне накладалі швы. Да шчасця, абышлося, хоць апошнія два кулькі даліся цяжка, і галава яшчэ пабольвае».

Гэта 132-ы рэкорд 50-гадовага Харанекі за дваццаць гадоў спецыялізацыі ў экстрэмальным узняцці цяжары. Наступны рэкорд ён плануе ўстанавіць 9 верасня ў Мінску на футбольным матчы Беларусь — Расія, прысвечаным 100-годдзю беларускага футбола. Асілак пастараецца сто разоў падняць уверх на прамых руках хутчэй, чым за 9 хвілін 55 секунд 40-літровую бочку з вадой.

ГЕАПАЛІТЫКА

# ПОШУКІ БУДУЧЫНІ

Вольга ХВОІН

**Каб захаваць сябе пры ўладзе, Аляксандр Лукашэнка гатовы прыцягнуць знешнія сілавыя рэсурсы. Арабскія рэвалюцыі і ўласнае, цяпер ужо не безагаворачна ўпэўненае становішча на палітычным алімпе спарадзіла ў беларускага лідара ідэю надаць Калектыўным сілам аператыўнага рэагавання АДКБ функцыю гаранта ўлады.**




### Для даведкі:

Гісторыя АДКБ бярэ свой пачатак ад 15 мая 1992 года, калі ў Ташкенце Арменія, Казахстан, Кіргізія, Расія, Таджыкістан і Узбекістан падпісалі Дамову аб калектыўнай бяспецы, якая ўступіла ў сілу 20 красавіка 1994 года. Беларусь далучылася да дамовы 31 снежня 1993 года ўслед за Грузіяй (9 верасня 1993 г.) і Азербайджанам (24 верасня 1993 г.). У красавіку 1999 года прэзідэнты Беларусі, Арменіі, Казахстана, Кіргізіі, Расіі і Таджыкістана падпісалі пратакол аб працягненні тэрміну яго дзеяння на наступны пяцігадовы перыяд, у той час як Азербайджан, Грузія і Узбекістан адмовіліся ад далейшага ўдзелу. 14 мая 2002 года ў Маскве было вырашана стварыць паўнавартасную міжнародную арганізацыю і пасля падпісання ў кастрычніку гэтага ж года Статута і Пагаднення аб прававым статусе (уступілі ў сілу 18 верасня 2003 г.) з'явілася Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы, якая ўжо ў снежні 2004 года атрымала статус назіральніка ў Генеральнай Асамблеі ААН. На сённяшні дзень у склад АДКБ уваходзяць Арменія, Беларусь, Казахстан, Кіргізія, Расія, Таджыкістан і Узбекістан (аднавіў свой удзел у жніўні 2006 года).

Калі ў 2009 годзе Лукашэнка зацягваў падпісанне дамовы аб Калектыўных сілах аператыўнага рэагавання, то цяпер ён заяўляе пра неабходнасць надаць гэтай структуры правы для ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў-удзельніц АДКБ. Нагадаю, што ў чэрвені 2009 года члены АДКБ, апроч Беларусі, падпісалі дакументы па КСАР, Лукашэнка з-за «малочнай вайны» з Расіяй тады адмовіўся гэта рабіць. У выніку дамова з боку Беларусі была падпісаная толькі ў кастрычніку 2009-га.

## Вайсковы гарант гаранта

Пра тое, што Калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання мусяць стаць на варце палітычных рэжымаў дзяржаў-падпісантаў, кіраўнік Беларусі гаварыў яшчэ ў 2010 годзе. Ён называў бесперспектыўнай далейшую дзейнасць АДКБ, бо арганізацыя не рэагуе на «дзяржаўны пераварот у адной з краін-сябраў».

На нефармальным саміце лідараў краін-удзельніц АДКБ, які праходзіў у Маскве, Лукашэнка прадставіў заяву Курманбека Бакіева (у Кыргызстане вясной 2010 года адбылася рэвалюцыя, і Бакіў збег з краіны) з заклікам увесці ў Кыргызстан вайсковы кантынгент. Аднак гэтая прапанова была адхіленая. Была прынятая заява кіраўнікоў дзяржаў-сябраў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, у якой «падзеі красавіка 2010 года ў Кыргызскай Рэспубліцы, што прывялі да неканстытуцыйнай змены ўлады», разглядаюцца членамі АДКБ як «унутраныя справы» гэтай краіны.

Цяпер, калі патэнцыйная пагроза звяржэння палітычнага рэжыму навісла над Беларуссю, яе палітычны лідар зноў выказваецца за наданне КСАР паліцэйскай функцыі.

«Фронтам, вайной ніхто сёння на нас не пойдзе, а вось канстытуцыйны пераварот здзейсніць рукі свярбяць у многіх, — растлумачыў сваю пазіцыю Лукашэнка падчас сустрэчы з генеральным сакратаром АДКБ Мікалаем Бардзюжам 30 жніўня бягучага года. — Мы павінны абараніць цэласнасць і незалежнасць краін АДКБ». «Што тычыцца пытання ўзбраення для КСАР, то Мядзведзеў падтрымаў беларускі бок у тым, што трэба тэрмінова даўзброіць, даўкамплектаваць гэтыя сілы, калі мы хочам мець гэтую цэласную арганізацыю, — заявіў беларускі лідар, спасылаючыся на вынікі апошніх перамоў з прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым у Сочы. — Мы сур'ёзна абмеркавалі дадзеную праблему, і гэта будзе значная падтрымка краінам, якія ўваходзяць у АДКБ».

**Ці напраўду гатовыя члены АДКБ на практыцы падтрымаць увядзенне войскаў на тэрыторыю суверэннай дзяржавы, бо гэта патрабуе моцнай палітычнай волі і рашучасці?**



Па словах Лукашэнкі, ён абмеркаваў з прэзідэнтам Расіі падчас нефармальнага саміту АДКБ пытанне аб тым, што ваенныя базы замежных дзяржаў у краінах АДКБ будуць размяшчацца са згоды савета кіраўнікоў дзяржаў арганізацыі.

Ініцыятыву Лукашэнкі зразумець можна. У беларускім грамадстве нарастае сацыяльная незадаволенасць, выкліканая істотным пагаршэннем эканамічнай сітуацыі. Але ці напраўду гатовыя члены АДКБ на практыцы падтрымаць увядзенне войскаў на тэрыторыю суверэннай дзяржавы, бо гэта патрабуе моцнай палітычнай волі і рашучасці, да ўсяго негатыўна ўплывае на імідж дзяржавы?

«Звярніце ўвагу, што Масква гэта афіцыйна амаль не каментуе. Патрэбы ўводзіць расійскія войскі ў Беларусь няма. У нас тут не Чачня, — гаворыць палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі. — Я больш асцерагаўся б таго, каб тут не з'явіўся расійскі спецназ, і не скінуў дзеючага кіраўніка на манер Афганістану. А Лукашэнка проста напалоханы афрыканскімі, лівійскімі справамі. Я насамрэч не ўяўляю, што кіргізскія войскі будуць тут, ці нашы — там. Дарэчы, кіргізы папрасілі NATO ўзмацніць мяжу з Афганістанам. Бо гэта ёсць рэальны дзеючы інструмент, а не АДКБ. І яшчэ звярніце ўвагу: заявы Лукашэнкі ніхто не тое, што не падтрымаў, але і не каментуе. Маскве ўсё гэта нагнятаць папросту няма сэнсу».

Расійская газета «Известия» прыводзіць словы сваёй крыніцы ў Крамлі. Там патлумачылі, што беларускі лідар хоць і лічыцца саюзнікам Расіі, аднак ідэю дапамогі з боку АДКБ «выкарыстаў у сваіх мэтах і вульгарызаваў». Сама ініцыятыва нарадзілася ў ходзе нефармальнага саміту, які прайшоў 12 жніўня ў Астане, і аўтарства належыць Маскве, хоць агучваў яе Лукашэнка. «Размова ідзе пра выкарыстанне патэнцыялу АДКБ для абароны канстытуцыйнага ладу. Калі нацыянальныя сілы папросту не ў стане справіцца з сітуацыяй, калі сітуацыя ідзе ў разнос, існуе пагроза жыццю і бяспецы грамадзян, адбываюцца масавыя рабаванні і марадзёрства, тады АДКБ можа ўмяшацца. Тое, што адбылося ў снежні 2010 года ў Мінску, — гэта ўнутраная справа дзяржавы», — патлумачыў «Известиям» Мікалай Бардзюжа.

## У папа быў сабака...

Падчас сочынскіх перамоў паміж кіраўнікамі Беларусі і Расіі ў чарговы раз была ўзнятая тэма «партнёрства двух народаў». «Лідары дзвюх краін крытычна падышлі да ацэнкі стану беларуска-расійскіх адносін і канстатавалі, што яны не адпавядаюць статусу стратэгічнага партнёрства. Былі названыя пэўныя праблемы, якія па ўзаемнай думцы павінны быць знятыя ў бліжэйшай перспектыве. Прэзідэнты дамовіліся, што, пачынаючы з гэтай сустрэчы, яны распачнуць шэраг практычных крокаў па аднаўленні высокага ўзроўню партнёрства паміж дзвюма краінамі, — гаворыцца ў афіцыйным паведамленні. — У сувязі з гэтым кіраўнік расійскай дзяржавы асабліва падкрэсліў, што мы — беларусы і расіяне — брацкія народы, звязаныя цеснымі вузамі, і мы ведаем, што трэба распачаць, каб не дапусціць разрыву брацкіх адносін».

«Прэзідэнт Беларусі асабліва адзначыў, што неабходна забяспечыць безумоўнае паўнавартаснае функцыянаванне Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі з 1 студзеня 2012 года. Беларусь панесла сур'ёзныя выдаткі, далучыўшыся да гэтага праекту, але ідэя АЭП была свядома падтрыманая, бо важна ствараць роўныя ўмовы для прадпрыемстваў і грамадзян на гэтай прасторы. Расійскі прэзідэнт выказаў прынцыповую згоду з пазіцыяй беларускага калегі», — паведаміла прэс-служба Лукашэнкі.

Аднак высокае партнёрства паміж Расіяй і Беларуссю ў разуменні Лукашэнкі, відаць, не знаходзіць практычнага ўвасаблення. Інакш кажучы, моцнай фінансавай падтрымкі Беларусі з боку Расіі цяпер не назіраецца. І кіраўнік Беларусі зноў спрабуе наладзіць разарваныя адносіны з Еўрасаюзам. І ёсць знакі таго, што ЕС не выдаў незваротна чорную метку беларускаму рэжыму. На пачатку жніўня на свабоду выйшлі дзевяць фігурантаў справы аб масавых беспарадках 19 снежня мінулага года.

Напрыканцы жніўня з'явілася інфармацыя, што міністр замежных спраў Балгарыі Мікалай Младэнаў меў сустрэчу ў Мінску з Лукашэнкам. Пасля чаго былі вызвалены яшчэ чацвёра палітвязняў. Была агучаная ідэя зладзіць дыялог (любімае слова еўрапейскіх палітыкаў) аб будучыні Беларусі з прадстаўнікамі апазіцыі. У якасці назіральнікаў быццам бы нават будуць запрошаныя прадстаўнікі Расіі і ЕС. Але еўрапейскія палітыкі пасля таго, як абнясlавілі сябе даверлівасцю і недальнабачнасцю ў гульнях у лібералізацыю з Лукашэнкам, пакуль публічна займаюць цвёрдую пазіцыю.

Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі пакуль не бачыць істотных зрухаў на знешнепалітычным полі Беларусі. «Балгарскі міністр выканаў ролю санітаркі на мінным полі, калі выказвацца словамі Васіля Быкава. І, калі меркаваць па заявах палітыкаў з Брусэлю, нічога ён не дамогся. Мяркую, што вызваленне палітвязняў будзе, але своеасаблівае. Не выключаю, што іх могуць проста выслаць з краіны. Не бачу іншага варыянта, напрыклад, для Саннікава, які гаворыць, што ёсць толькі адзін варыянт перамоў з Лукашэнкам — перадача ўлады», — разважае спадар Якаўлеўскі.

Так, пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Розмары Томас (Вялікабрытанія цяпер старшынствуе ў ЕС) у інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс-Захад» заявіла, што найперш ад беларускіх уладаў чакаюць не толькі вызвалення, але і рэабілітацыі асуджаных па справе «19 снежня». Каментуючы заяву Аляксандра Лукашэнкі аб дыялогу з апазіцыяй пры ўдзеле ЕС і Расіі, спадарыня Размары Томас заўважыла, што афіцыйнага запрашэння пакуль не паступіла. Дзяржавы ЕС хацелі б пачуць у часе гэтага дыялогу «аб фармаванні ў Беларусі шматпартыйнай дэмакратыі». «Еўрапейскі саюз так і не ачуняў ад глыбокага шоку і засмучэння», якія зазнаў пасля падзеяў 19 снежня ў Беларусі», — дадала брытанскі дыпламат.

МЕРКАВАННЕ

# ВЕРТЫКАЛЬ

Андрэй РАСІНСКІ

**Чым мацней прэзідэнцкая вертыкаль, тым горш людзі харчуюцца, тым большае беспрацоўе і тым хутчэй месцічы развітваюцца з жыццём.**

Адным з найгалоўных дасягненняў улады абвяшчаецца «моцная прэзідэнцкая вертыкаль», якая гарантуе «стабільнасць» і «росквіт». Нават эканамічны крызіс амаль не змяніў прапаганды: чым «таўсцейшая» вертыкаль — тым лепей мусіць быць людзям.

Ці так гэта на самай справе?

Я ўзяў АФІЦЫЙНЫЯ звесткі, выкладзеныя на сайце Беларускага статыстычнага камітэта: беспрацоўе, узровень забойстваў, спажыванне мяса, заробкі. Зразумела, некаторыя лічбы «палепшаныя»: так, у беларускіх справаздачах падаюцца не ўсе беспрацоўныя, а толькі зарэгістраваныя. Але для нашых разлікаў хопіць.

Цяпер ацэнім магутнасць вертыкалі. Працэнт датэрміновага галасавання найлепшым чынам распавядзе пра яе сілу і адданасць прэзідэнту.

Датэрміновае галасаванне ў нашых умовах — справа палітычная. На гэтую палітычную справу працуюць: сродкі прапаганды (за нашы грошы), дэканы і каменданты студэнцкіх інтэрнатаў, кіраўнікі прадпрыемстваў, чыноўніцы перадпенсійнага веку — дый процьма малых і вялікіх ідэолагаў-вертыкальнікаў, што паабселі беларускія мястэчкі і гарады.

Пры гэтым не істотна, як людзі галасуюць — і нават колькі прагаласавала датэрмінова. Здольнасць беспакарана абвясціць патрэбную лічбу — ключавая вертыкальная цнота. Па ёй — і ацэнім.

На апошніх выбарах прэзідэнта самай моцнай была Віцебская вертыкаль — 36,9% датэрміновага галасавання (разлікі я зрабіў па дадзеных Цэнтрвыбаркаму). За ёй ішла Гродзенская — 31,5%. Трэцяе месца заняла вертыкаль Брэсцкай вобласці — 29,3%. Магілёўская, Гомельская і Мінская вобласці прадэманстравалі меншую прэзідэнцкую адданасць — 27,9%, 26,4% і 24,6%. І самыя правальныя лічбы даў «свядомы» — як скардзіўся Лукашэнка — Мінск. Нягледзячы на процьму студэнтаў і дзяржаўных службоўцаў, падвешаных на кантракце, — усяго 22%.

Зазірнем у табліцу.










Апошні радок — так званы каэфіцыент карэляцыі. Калі ён блізкі да нуля, то сувязі паміж з'явамі няма. Калі «+1», то сувязь жорсткая і наўпроставая, а «-1» — адваротная. Бачна, што ўзмацненне вертыкалі суправаджаецца збядненнем насельніцтва (сувязь не самая магутная, але яна ёсць).Забойствы і самазабойствы з яшчэ большай ахвотай упадабалі вертыкальную моц. Вельмі сур'ёзная повязь ёсць паміж беспрацоўем і ганаровымі лічбамі датэрміновага галасавання.

Затое чым «таўсцейшая» вертыкаль, тым меншы заробак, тым хутчэй ідзе выміранне і меней на стале шкварак.

Зрэшты, лепей палюбавацца на графіках.

Застаецца пытанне: людзі гібеюць ад таго, што вертыкаль моцная, ці гэта вертыкаль сілкуецца людской слабасцю і паразітуе на ёй? Лічбы не даюць адказу на гэтае пытанне, але паказальная сувязь паміж «моцнай» вертыкаллю і доляй пенсіянераў: чым болей залежных ад дзяржавы старых, тым мацнейшая прэзідэнцкая ўлада.

**ТАБЛІЦА.** ПРЭЗІДЭНЦКАЯ ВЕРТЫКАЛЬ І ЎЗРОВЕНЬ ЖЫЦЦЯ

| | Вобласць Беларусі | Моц вертыкалі (у % датэрміновага галасавання) | Насельніцтва ніжэй за пражытківы мінімум, %, 2009 | Вонкавыя прычыны смерці, на 100 тысяч, 2009 | Самазабойствы на 100 тысяч, 2009 | Смяротнасць ад забойстваў, мужчыны, на 100 тысяч, 2009 | Пенсіянераў на 1000, 2009 | Узровень зарэгістраванага беспрацоўя, %, мужчыны, 2009 | Прырост насельніцтва, студзень-люты 2011, на 1000 | Сярэдні заробак, студзень 2011, тыс. руб. | Спажыванне мяса ў год на чалавека, кг, 2008 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Віцебская | 36,9 | 7,2 | 179,1 | 40,2 | 13,8 | 286,8 | 1,1 | -7,5 | 1 284 | 60 |
| 2 | Гродзенская | 31,5 | 4,3 | 155,4 | 34,0 | 10,8 | 281,5 | 1,0 | -5,2 | 1 254 | 67 |
| 3 | Брэсцкая | 29,3 | 8,1 | 131,5 | 25,5 | 7,5 | 269,2 | 0,8 | -3,2 | 1 249 | 62 |
| 4 | Магілёўская | 27,9 | 6,3 | 158,9 | 35,1 | 8,9 | 274,5 | 0,8 | -5,9 | 1 280 | 60 |
| 5 | Гомельская | 26,4 | 6,6 | 151,2 | 28,4 | 8,7 | 271,1 | 0,9 | -4,5 | 1 357 | 65 |
| 6 | Мінская | 24,6 | 5,8 | 176,6 | 36,1 | 11,2 | 276,2 | 0,8 | -5,8 | 1 359 | 71 |
| 7 | Мінск | 22,0 | 1,1 | 95,9 | 11,5 | 3,1 | 239,2 | 0,4 | 0,5 | 1 843 | 73 |
| карэляцыя | | | 0,554 | 0,580 | 0,684 | 0,763 | 0,774 | 0,855 | -0,702 | -0,666 | -0,728 |

© Андрэй Расінскі. Разлікі паводле Беларускага статыстычнага камітэту і Цэнтрвыбаркаму

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# БЯСКОНЦА ДРЭННА І БЯСКОНЦА ДОЎГА



**Як не перастаюць цвердзіць з высокіх трыбун і дудзець у прапагандысцкія рупары, Беларусь застаецца сацыяльнай дзяржавай, у палітыцы якой паранейшаму галоўным з'яўляецца чалавек. І гэта на самай справе так.**

Бо ў краінах з такой эканомікай, якая існуе ў Беларусі, грошы зарабляць нельга. Іх можна або пазычыць за мяжой, або скрасці. Але надышоў момант, калі пазыкаў больш не даюць, а ўсе лепшае, што было створана раней, не адзін раз скрадзена і перапрададзена, ці пушчана, як кажуць па паветры не ў меру руплівымі гаспадарамі.

І цалкам лагічна выходзіць, што адзінай грашовай крыніцай дзяржавы застаецца той самы чалавек (народ), які ў масе сваёй змушаны рабіць нейкія запасы на чорны дзень. І таму заўжды нешта мае ў кішэні. Увогуле, не шмат, але ж калі памножыць на мільёны, то нешта наскрабеш. Трэба адзначыць, што былі ва ўрадзе гарачыя галовы, якія прапанавалі вывернуць кішэні кожнаму і вытрасці ўсё адразу. Казалі ж, што нельга адсякаць кату хвост у некалькі прыёмаў. Але перамаглі гуманісты. Вырашылі спачатку са здабытага кожным насельнікам рубля «стрэсці» 56 капеек, і пабачыць, як ён сябе будзе паводзіць.

Зразумела, у кожнага паасобку гэта выклікала незадаволенасць, нехта нават палаяўся з жонкай, нехта з мужам, нехта перастаў глядзець БТ, але ў цэлым усё засталося, як і было. Калі хто і рашыўся пратэставаць, то імкнуўся рабіць гэта эстэтычна. Каб уладам не замінаць і не ствараць перашкоды грамадскаму транспарту.

Карацей, вышэйшы пілатаж кіравання паводзінамі вялікай колькасці людзей з аднаго боку, і кволыя спробы вырвацца з-пад кантролю, з другога. Большае палітычнае майстэрства мусіць існавала толькі ў старажытных усходніх дэспатыях, калі ахвяравалі правіцелям усе свае набыткі і прасілі султана праявіць вышэйшую міласць — адсекчы галаву.

Нешта падобнае існавала ў нашых калгасах, якія для выканання «первой заповеди» — разлікаў з дзяржавай — аддавалі ўвесь ураджай, застаючыся зімаваць з пустымі сусекамі.

У нас жа яшчэ па-божаску. З кожнага рубля заставалася на руках па 44 капейкі, ад якіх паабяцалі адбіраць па 5% на месяц. Маўляў, каб «не допустить резкого обнищания трудящихся». Бо калі ад 44 адняць 2,2 капейкі, то застанецца яшчэ 41,8 капейкі, а яшчэ праз месяц прыйдзецца аднімаць усяго 2,09 капейкі, і застанецца ўсё яшчэ 39,71 капейкі. Ад меншай велічыні працэнт будзе меншы. Гэта значыць, што працэс можа доўжыцца вечна, а грошы ў шараговых беларусаў не скончацца ніколі.

Як ні круці, але гэта новая філасофская трактоўка абсалютнай аднолькасці суб'ектыўнага субстрату ў часе і прасторы. Гэта раней нейкі ёлупень сказаў, што беларусы будуць жыць дрэнна, але не доўга. А зараз яны будуць жыць бясконца дрэнна і бясконца доўга. Карацей, адкрыццё на ўзроўні Эйнштэйна. І калі, як кажуць, у хуткіх часе ў амерыканцаў з'явіцца патрэба запускаць людзей на Марс, то лепшы чалавечы матэрыял яны наўрад ці знойдуць. Упакоўвай беларусаў, выдавай па долару на брата, і адпраўляй па разлічаным курсе. Яны і даляцяць, і яблыні пасадзяць, і дажывуць-дачакаюцца масавага прылёту новых каланістаў. Праўда, калі дакладна будуць ведаць, што сярод іх не будзе нікога з маладых-старых уладароў вертыкалі.

Усё ж меў рацыю Леанід Козік, калі прапанаваў уручыць Лукашэнку Нобелеўскую прэмію па эканоміцы ды прызначыць яго галоўным сярод усіх лаўрэатам. Бо зразумела, калі гаворка заходзіць пра вечнае, адразу ўспамінаецца бясконцае. Літаральна тое, што не мае канца. Усе памятаюць, што пачатак нейкі некалі быў, але куды дзеўся — невядома. А канец вось ён, тут. Ці, як сказаў бы дзядуля Фрэйд, кволае жаданне да нечага яшчэ засталося, яшчэ памкненні па начах спаць не даюць, а патэнцыі ўжо няма. Можа нешта, што яго падымае, атрафіравалася, можна не вытрывала шматгадовага фізіялагічнага служэння, але выніку няма. Ці ён такі нязначны, што нават сямейнаму доктару не адразу прызнаешся.

Вось, прыкладам, старшыня гомельскага аблвыканкама распавёў БелТА і пра сацыяльную дзяржаву, і пра сапраўдную каштоўнасць чалавека для яе, дзякуючы чаму прамысловасць падрасла на 10,2%, экспарт амаль падвоіўся і перагнаў па тэмпах росту імпарт. І зніжаць тэмпы, па яго словах, рэгіён не мае намеру.

У нас заўжды так, намеру ніхто не мае, а калі што здараецца, то ненаўмысна. Прыкладам, дэвальвацыю рабілі, каб павялічыць экспарт і паменшыць імпарт і ўрэшце выйсці на дадатнае сальда. А што атрымалася? Адмоўнае сальда ў гандлі з асноўным партнёрам Расіяй за сем месяцаў павысілася на 1,8 мільярда долараў супраць рэкорднага мінулагодняга і склала амаль 6 мільярдаў.

Гэта значыць, што на дадатны ўзровень яго спатрэбіцца выводзіць вечна. А калі хутка, то толькі знянацку.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# АНДРЭЙ ПРАТАСЕНЯ НЕ ЗБІРАЕЦЦА Ў ВЯЛІКУЮ ПАЛІТЫКУ

Вольга ХВОІН

**А. Лукашэнка падпісаў указ аб памілаванні яшчэ чатырох палітвязняў, асуджаных за ўдзел у акцыі пратэсту 19 снежня. Алесь Кіркевіч, Андрэй Пратасеня, Алег Гнедчык і Зміцер Даронін вярнуліся да сваіх родных.**


Фота аўтара
Андрэй Пратасеня па вызваленні з калоніі

Андрэй Пратасеня не мае палітычнай заангажаванасці, хаця і адседзеў некалькі месяцаў за ўдзел у палітычнай акцыі. Затое малады чалавек мае адкрытую ўсмешку і перакананне, што сумленне яго чыстае перад сабою і Беларуссю. 5 мая судом Кастрычніцкага раёна Мінска ён быў прызнаны вінаватым па частцы 2 артыкула 293 Крымінальнага кодэкса (удзел у масавых беспарадках) і асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Пасля вызвалення з бабруйскай калоніі Андрэй на некалькі дзён патрапіў пад увагу журналістаў — тэлефон былога палітвязня не змаўкаў ад званкоў як з беларускіх, так і з замежных СМІ. «Славы мне не трэба. Героем я сябе не адчуваю, — разважае Андрэй, — тым больш я напісаў прашэнне аб памілаванні, і вакол гэтага многа абмеркаванняў. Нехта гаворыць: «Ганьба, здраднікі». Ёсць грамадская ўвага да справы, абмеркаванне. І ад гэтага адчуваеш сябе пад прыцэлам».

Андрэю прапаноўвалі напісаць прашэнне аб памілаванні яшчэ на пачатку жніўня. Тады на свабоду выйшлі дзевяць палітвязняў. Абмяркоўваць, чаму ў мінулы раз ён адмовіўся падпісваць прашэнне аб памілаванні, а цяпер гэта зрабіў, Андрэй не захацеў.

— Прыміце гэта як факт: спачатку я адмовіўся, і мяне, можна сказаць, пакінулі ў спакоі. А потым я прыйшоў і напісаў сам. Сцісла патлумачыць я не змагу, а разгорнуты адказ зойме цэлую кнігу, — кажа хлопец.

На судзе Андрэй цалкам прызнаў сваю віну. Што ён сапраўды паддаўся ўплыву натоўпу і двойчы ўдарыў па шчытах супрацоўнікам міліцыі, якія знаходзіліся ў будынку Дома ўрада. А адзін шчыт, якімі былі забарыкадаваныя дзверы будынку, ён выцягнуў вонкі. Але сцвярджае, што ў яго не было свядомай мэты прычыніць каму-небудзь нейкую шкоду або прарвацца да будынка Дома ўрада.

— Так складана. Я заўжды гавару праўду, нават у дробязі хлусіць для мяне складана. І таму нават на судзе многа «падвісаў» над некаторымі пытаннямі. І не з-за таго, што я хацеў увільнуць. Проста гэты парыў, учынак настолькі складаны, некантралюемы. Мне і на судзе было складана з гэтым разабрацца, назваць дакладную прычыну, чаму я так зрабіў. Пяць хвілін маіх дзеянняў вельмі складана неяк ахарактарызаваць, гэта збег абставінаў, сукупнасць фактараў. У прашэнні я напісаў тое ж, што гаварыў на судзе.

***— А калі б экс-кандыдаты ў прэзідэнты напісалі прашэнні аб памілаванні на імя Лукашэнкі?***

— Я жыццё разглядаю з пункту сумлення, гонару. Ніякія фізічныя пакуты ніколі не параўнаюцца з душэўнымі перажываннямі. Я падпісаў памілаванне, нідзе не зманіў, праз сябе не пераступіў, і тое суткамі ляжаў і думаў. Часам было вельмі цяжка, думаў, мо і праўда трэба было не падпісваць і выйсці чыстым. А экс-кандыдатаў увогуле абвінавачваюць у тым, чаго яны не рабілі. Чалавеку невінаватаму пісаць, што ён раскайваецца, прызнае сваю віну... Ды яшчэ на імя свайго суперніка, ворага... Гэта будзе яўна выглядаць, што ты ідзеш супраць сябе.

***— Ты ж разумееш, што твая асоба — прадмет палітычнага гандлю? І як пачуваешся, асэнсоўваючы, што ты ўсяго толькі разменная манета ў чужых інтарэсах?***

— Я жыў заўсёды з сябрамі, роднымі ў звычайных чалавечых адносінах. А тут чалавечнасцю, гуманнасцю нават і не пахне. Што б ты ні зрабіў, гэта выкарыстоўваецца на выгаду, тваё становішча — каб пагандлявацца. Гэта не здзіўляе, але крыху шакіруе. Для звычайнага чалавека гэта ўсё не зразумела. Вялікая палітыка — гэта такі асобны свет, і я не хачу туды лезці. Проста так атрымалася, што патрапіў. Я разумеў, што натварыў, што закон усё ж пераступіў. Але ўсе, хто былі на Плошчы, жадаюць жыць у іншай краіне, хацелі б бачыць Беларусь квітнеючай і паспяховай. І было крыху страшна, але да апошняга не верылася, што ўсе падзеі будуць развівацца ў такім рэчышчы. Свядомасць працівілася факту таго, што я паеду ў калонію. Увогуле, складваецца ўражанне, што дзяржава робіць усё магчымае, каб думаючыя, ініцыятыўныя людзі як мага хутчэй з'ехалі з Беларусі.

***— Ты пераасэнсоўваў падзеі 19 снежня 2010 года? Ці мела месца, на твой погляд, спланаваная правакацыя?***

— Складана сказаць. Канешне, кандыдаты ні да чаго дэструктыўнага не заклікалі, наадварот. Магчыма, гэта была правакацыя ці чыйсьці план. Але некаторыя факты выклікаюць падазрэнні. Міліцыя з'явілася толькі тады, калі ўжо ўсё паграмілі. Нават на судзе ў прадстаўнікоў міліцыі, якія здымалі ўсё на відэа, пыталіся: «Што ў вашы функцыі ўваходзіць?» — «Ахова парадку», — «То чаму вы здымалі, а не стрымлівалі людзей?»

***— Якія ўражанні засталіся ад калоніі?***

— Гэта як піянерскі лагер. Многія едуць туды з адчуваннем, што там творыцца нешта ненармальнае, серыялаў наглядзяцца, клішэ нейкія працуюць. А напраўду ў той калоніі ніхто цябе не «ламае», выпрабаванняў не ладзіць. Іншая справа, што ўсё абвастраецца. Нехта не атрымлівае перадачаў, і чалавек можа нават пачаць красці ў іншых. Хто быў добры, той будзе імкнуцца знайсці вакол сябе такіх жа людзей. Якасці, якія былі ў чалавека, проста крыху абвастраюцца.

У калоніі я спачатку быў начным днявальным, нічога асаблівага — сядзеў на вартавым пункце і чытаў кнігі. Потым працаваў дворнікам, упакоўшчыкам у цэху, дзе шылі спецвопратку. У вольны час чытаў кнігі, пісаў лісты, думаў, аналізаваў сваё жыццё. Мне вельмі многа пісалі лістоў. Вялікі дзякуй людзям, якіх я нават не ведаю, але якія пісалі мне лісты, падтрымлівалі. Калі штодзень прыносяць па пяць лістоў, гэта выклікае нават зайздрасць у іншых вязняў.

Лазня з гарачай вадой была раз на тыдзень. Ва ўмывальніку мыцца і праць вопратку не дазвалялі. Дзе сушыць вопратку, таксама не зразумела. У калоніі вельмі аднастайнае харчаванне. І гэта адразу адбіваецца на стане скуры, псуюцца зубы. Быў жнівень, а многія хадзілі з насмаркам.

***— Ці будзеш дабівацца рэабілітацыі, каб знялі судзімасць?***

— Ва ўмовах цяперашняй сістэмы гэта складана, яна такая... прагніла, пражавела. Думаю, калі ўлада зменіцца, то рэабілітацыя будзе магчымай. А самаму мець нейкія справы з гэтай сістэмай мне брыдка — пісаць нейкія скаргі, сутыкацца з імі мне ўжо брыдка. Таму цяпер у мяне няма думак пра тое, каб гэтага дабівацца. Я пакуль не ведаю, як гэтая судзімасць будзе ўплываць на маё жыццё. Але, спадзяюся, з працаўладкаваннем перашкодаў не будзе. Хаця ведаю, што для многіх людзей, якія выходзяць з калоніі, наяўнасць судзімасці ёсць вялікай праблемай — іх ніхто не хоча браць на працу.

*Да журналістаў «Reuters» патрапіў ліст міністра замежных спраў Балгарыі Нікалая Младэнава да вярхоўнай прадстаўніцы замежных спраў і бяспекі Еўрасаюза Кэтрын Эштан. Младэнаў паведамляе, што з Лукашэнкам меў сустрэчу ў Мінску напачатку жніўня, і ён паабяцаў да сярэдзіны кастрычніка вызваліць усіх палітзняволеных.*

КАЛОНКА ЮРЫСТА

# ПІЦЬ І ЛАЯЦЦА ЗАБАРАНЯЕЦЦА

**Прапануем вашай увазе адказы юрыста-праваабаронца Алега Волчака на пытанні чытачоў.**



- *Мяне з сябрам у 5 раніцы затрымалі супрацоўнікі міліцыі за тое, што мы ў стане алкагольнага ап'янення лаяліся нецэнзурнай лаянкай. У судзе нам далі штраф за супраціўленне міліцыі, якое мы не аказвалі. Сведак не было. Што можна зрабіць?*
  *Курэня С. П., Мінск*

Гэта сітуацыя тыповая не толькі для Мінска, але і іншых гарадоў Беларусі. На жаль, калі адсутнічаюць сведкі ў канфлікце паміж грамадзянінам і супрацоўнікам міліцыі, судовая сістэма, як правіла, лічыць больш праўдзівымі сведчанні супрацоўнікаў міліцыі. Звычайна суд спасылаецца на тое, што супрацоўнік міліцыі выконваў свае службовыя абавязкі, а таму ён не можа казаць няпраўду. Аднак, у любым выпадку, вам трэба ведаць вашы правы ў дадзенай сітуацыі.

Паводле артыкула 2.7 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса РБ аб адміністрацыйных правапарушэннях, асоба не можа быць прыцягнутая да адміністрацыйнай адказнасці, пакуль у парадку, устаноўленым гэтым кодэксам, не будзе даказана яе вінаватасць у здзяйсненні правапарушэння. Абавязак даказваць вінаватасць асобы, у дачыненні да якой вядзецца адміністрацыйны працэс, ускладаецца на службовую асобу органа, што вядзе адміністрацыйны працэс. Асоба, у дачыненні да якой вядзецца адміністрацыйны працэс, не абавязана даказваць сваю невінаватасць. Акалічнасці, выкладаныя ў пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні, у пастанове пра накладанне адміністрацыйнага спагнання, не могуць грунтавацца на здагадках.

Сумневы ў абгрунтаванасці высновы пра вінаватасць асобы, у дачыненні да якой вядзецца адміністрацыйны працэс, тлумачацца на яе карысць.

Лічу, што ў вашай сітуацыі ёсць шанец пазмагацца за вашы правы. У першую чаргу, вы маеце права азнаёміцца з усімі матэрыяламі адміністрацыйнай справы, пасля чаго напісаць скаргу пракурору раёна ці скаргу ў Мінскі гарадскі суд. Вядома, лепш скаргу пісаць разам з юрыстам.

- *Знаходжуся на прымусовым лячэнні ў ЛПП (лячэбна-працоўным прафілакторыі). Чаму ЛПП належаць да Дэпартамента выканання пакаранняў МУС? Лічу гэта парушэннем правоў чалавека.*
  *Бялецкі С. М.*

На жаль, гэта не з'яўляецца парушэннем правоў чалавека. Гэта асаблівасць дзяржаўнага ўладкавання. Такія пытанні ў кампетэнцыі вырашыць парламент ці прэзідэнт. Асабіста маё меркаванне, што тут ёсць яшчэ адна праблема. А ці патрэбныя нам такія ўстановы? Цікава, наколькі гэтыя метады дапамагаюць дзяржаве змагацца з людзьмі, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі? Ці ёсць статыстыка такой працы? Чаму міліцыя займаецца лячэннем такіх грамадзян? Тут патрэбны зусім іншы падыход у барацьбе з алкагалізмам. І займацца такой складанай праблемай павінна не толькі міліцыя, але і органы ўлады, грамадскія арганізацыі, цэрквы, а ў цэлым і ўсё грамадства. А таксама варта было б наогул перагледзець пытанне пра карыснасць такіх лячэбна-працоўных прафілакторыяў, бо мне здаецца, што ўсё гэта састарэла. ЛПП часцяком з'яўляюцца імітацыяй барацьбы з алкагалізмам, але не рэальна дапамагаюць хвораму чалавеку.

## 14 ВЕРАСНЯ, СЕРАДА

---

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**10.55** Серыял "Пацалунак Саката".
**12.10** Меладрама «Шчаслівага шляху!» (Расія-Украіна).
**14.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**16.55** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**17.55** Серыял "Пацалунак Саката".
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Бенфіка - Манчэстар Юн. Прамая трансляцыя.
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дэтэктывы».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.10** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Асяроддзе пасялення.
**00.10** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Жан-Клод Ван Дам». Францыя-Бельгія-Люксембург, 2008г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланне». Серыял.
**16.50** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**17.20** «Мінішчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Яркая зорка». Францыя - Вялікабрытанія - Аўстралія, 2009г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Дабро пажаліцца».
**23.20** «Забойная сіла 6». Серыял.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** Жансавет.
**10.45** Канцэрт «Leonard Cohen. Songs From The Roa».
**12.10** Рэальны свет.
**12.40** Спорт-кадр.
**12.10** «Кожны мае права быць розным».
**13.35** Казка «Руды, сумленны, закаханы» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**14.55** Гадзіна суда. Дзела сямейныя.
**16.00** Медычныя таямніцы.
**16.35** Медычныя таямніцы +.
**16.45** Прыгодніцкі баявік «Крапавы берэт» («Беларусьфільм»). 3-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Югра (Ханты-Мансійск). Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.35** Канцэрт «Leonard Cohen. Songs From The Roa».
**23.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Манчэстар Сіці-Напалі.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каменская-6».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.30** Тэлесерыял «Каменская-6».
**23.20** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.10** Навіны - Беларусь.
**00.20** Прэм'ера. «Гістарычны працэс».

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** Вострасюжэтны серыял «Пятля».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. «Ліль» (Францыя) - «ЦСКА» (Масква).
**01.35** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».

**EUROSPORT**

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45, 15.45, 01.00** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. Фінал.
**11.15** Тэніс «Матс поінт». Часопіс.
**11.45, 17.00** Вось дык так!!!
**12.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.10, 17.55** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Фінал.
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 21-ы этап.
**14.30** Веласпорт. Гран-пры (Канада).
**17.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.05** Абранае па серадах.
**19.10** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**19.15** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы. Шматбор'е (Германія).
**20.20** Конны спорт. Кубак нацый (Ратэрдам, Нідэрланды).
**21.20** Навіны коннага спорту.
**21.25** Гольф. Тур PGA.
**22.25** Гольф. Тур PGA. Чэмпіянат Deutsche Bank (Бостан, ЗША).
**23.25** Гольф. Адкрыты чэмпіянат KLM.
**23.55** Гольф. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Аўстрыі.
**00.05** Гольф. Гольф Мастэрс (Чэхія).
**00.15** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.20** Ветразевы спорт. MTDCUP (Іспанія).
**00.50** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.55** Формула 1. Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 7 серыя.
**08.35** Два на два (тэледыскусія).
**09.00** «Мой родны горад», серыял: 6 серыя.
**09.25** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.50** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.20** Сальда (эканамічная праграма).
**10.35** Госць «Белсату».
**10.50** «Ранча», серыял: 47 серыя.
**11.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**11.55** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**12.10** МакраФон: Канцэрт фальклорных гуртоў «Жывёлак» і «Стылё».
**12.40** «Арол», серыял: 7 серыя.
**13.40** Праект «Будучыня».
**14.10** «Мой родны горад», серыял: 6 серыя.
**14.35** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.00** Сальда (эканамічная праграма).
**15.15** Два на два (тэледыскусія).
**15.45** МакраФон: Канцэрт фальклорных гуртоў «Жывёлак» і «Стылё».
**16.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.20** Госць «Белсату».
**16.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 7 серыя.
**17.25** Хто ёсць кім?: «Станіслаў Шушкевіч».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 11 серыя.
**18.50** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**19.05** Вагон.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Выбар Саннікава», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**21.50** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 6 серыя.
**22.20** Два на два (тэледыскусія).
**22.45** Аб'ектыў.
**23.10** Гарачы каментар.

## 15 ВЕРАСНЯ, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.05** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Саката» (Беларусь).
**12.10** «Ясь і Яніна». Музычная камедыя («Беларусьфільм»).
**13.25** «Госці ў хату». Дак. фільм.
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**15.50** «Крышталь душы». Хранікальна-дакументальны фільм.
**16.25** Здароўе.
**17.00** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Саката» (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Спартовая меладрама «Мінесота» (Расія).
**23.55** Дзень спорту.
**00.05** Дак. цыкл «У пошуках праўды».

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дэтэктывы».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.10** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.10** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.40** «Зваротны адлік».
**00.10** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінішчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Яркая зорка». Францыя - Вялікабрытанія - Аўстралія, 2009г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланне». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.20** «Мінішчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Дарога». ЗША, 2009г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойная сіла 6». Серыял.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.05** Жансавет.
**10.45** Канцэрт «Rod Stewart. Live at Royal Albert Hall».
**12.20** Рэальны свет.
**12.50** Страсці па культуры.
**13.35** Казка «Руды, сумленны, закаханы» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**14.50** Гадзіна суда. Дзела сямейныя.
**16.00** Медычныя таямніцы.
**16.35** Медычныя таямніцы +.
**16.45** Прыгодніцкі баявік «Крапавы берэт» («Беларусьфільм»). 4-я серыя, заключная.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Дынама (Кіеў) - Сток Сіці. Прамая трансляцыя.
**21.55** КЕНО.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Фулхэм-Твентэ. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.45** Рэальны свет.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каменская-6».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.30** Тэлесерыял «Каменская-6».
**23.20** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.10** Навіны - Беларусь.
**00.20** Прэм'ера. «Паядынак».

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Вострасюжэтны серыял «Пятля».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.40** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Штурм» (Аўстрыя) - «Лакаматыў» (Расія).
**01.25** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».

**EUROSPORT**

**09.30** Конны спорт. Кубак нацый (Ратэрдам, Нідэрланды).
**10.30** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Фінал.
**12.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.10** Вось дык так!!!
**13.00** Спідвэй. Гран-пры (Італія).
**14.00** Спідвэй. Гран-пры (Швецыя).
**15.00** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы (Мадрыд, Іспанія).
**16.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Футбол.
**17.00** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы (Мадрыд, Іспанія).
**18.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Футбол.
**18.55** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы (Мадрыд, Іспанія).
**20.40** Конны спорт. Global Champions Tour (Рыа-дэ-Жанэйра, Бразілія).
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір The Battle.
**22.00** Снукер. Мастэрс (Сан-Паула, Бразілія). Дзень 1-ы.
**01.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір КО.
**02.00** Вось дык так!!!

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 6 серыя.
**08.00** «Дэтэрмінатар», серыял: 11 серыя.
**08.50** Эксперт.
**09.15** «Мой родны горад», серыял: 7 серыя.
**09.40** Праект «Будучыня».
**10.10** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**11.10** «Ранча», серыял: 48 серыя.
**12.00** Навігатар.
**12.15** Госць «Белсату».
**12.30** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 6 серыя.
**13.00** «Дэтэрмінатар», серыял: 11 серыя.
**13.45** Праект «Будучыня».
**14.15** Без рэтушы: «Выбар Саннікава», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**14.35** «Мой родны горад», серыял: 7 серыя.
**15.05** Эксперт.
**15.30** Навігатар.
**15.45** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Басаножа па свеце.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Госць «Белсату».
**18.20** «Праведнікі», тэлесерыял: 7 серыя.
**19.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бэркат і Маршо» — «Свабода і шчасце», дак. фільм, 2007 г., Чэхія.
**22.50** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 2 серыя.
**23.50** Аб'ектыў.
**00.15** Гарачы каментар.

## 16 ВЕРАСНЯ, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.05** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**12.10** «Жанчына, не схільная да авантур». Меладрама (Украіна).
**14.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**17.00** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**18.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** 60-ы штогадовы міжнародны конкурс прыгажосці «Міс Сусвет- 2011».
**00.10** Дзень спорту.
**00.25** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дэтэктывы».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Другі міжнародны фэст пародый «Вялікая розніца».
**23.30** «Наша Белараша».
**00.00** Фільм «Дрэнная кампанія».
**01.50** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Дарога». ЗША, 2009 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланне». Серыял. Закл. серыя.
**16.50** «Я-вандроўца».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Пацалунак на поспех». ЗША, 2006г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** Фільм «Бандыты ў масках». Францыя, 2007 г.
**01.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**09.00** Мюзікл «Дульсінея Табоская» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**11.30** Гаспадар.
**12.00** Час футболу.
**12.40** Дзіцячы прыгодніцкі фільм «Пра цмока на балконе, пра дзяцей і самакат» («Беларусьфільм»).
**13.55** Гадзіна суда. Дзела сямейныя.
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.35** Медычныя таямніцы+.
**15.45** Меладрама «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (СССР).
**17.55** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Тарпеда (Ніжні Ноўгарад). Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** Прыгодніцкі фільм-фэнтазі (Вялікабрытанія -Канада- Францыя).
**00.25** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**01.20** Дыялогі пра рыбалку.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Прэм'ера. Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каменская-6».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** Фільм «Пясочны дождж». 2008 г.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Вострасюжэтны серыял «Пятля».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Прэм'ера. Фільм «Ельцын. Тры дні ў жніўні».
**23.10** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**00.10** Вострасюжэтны фільм «Уцекачы».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Вось дык так!!!
**10.45** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Дзень 1-ы.
**12.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.10, 15.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Дзень 1-ы.
**13.00** Спідвэй. Гран-пры (Польшча).
**14.00** Спідвэй. Гран-пры (Капенгаген, Данія).
**17.30** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы (Мадрыд, Іспанія).
**19.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.10** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы (Мадрыд, Іспанія).
**20.30** Конны спорт. Агляд тыдня. Часопіс.
**21.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Дзень 2-і.
**01.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір КО.
**02.00** Матаспартыўны часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**08.30** МакраФон: Канцэрт фальклорных гуртоў «Жывёлак» і «Стылё».
**09.00** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**09.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.55** Форум (ток-шоу): «Вольныя СМІ ў несвабоднай краіне».
**10.40** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**11.15** «Расія. XX стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 2.
**11.45** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бэркат і Маршо» — «Свабода і шчасце», дак. фільм, 2007 г., Чэхія.
**12.45** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 2 серыя.
**13.45** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.10** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**14.40** Форум (ток-шоу): «Вольныя СМІ ў несвабоднай краіне».
**15.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бэркат і Маршо» — «Свабода і шчасце», дак. фільм, 2007 г., Чэхія.
**16.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.00** «Між намі, бусламі», мультсерыял для дзяцей: 2 серыя.
**17.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 2 серыя.
**19.05** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «B:N:».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Сальда (эканамічная праграма).
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**22.25** «Пітбуль», серыял: 27 серыя.
**23.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 17 ВЕРАСНЯ, СУБОТА

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Музычная камедыя «Дзяўчына з гітарай».
**12.50** Камедыя «Дачная паездка сяржанта Цыбулі».
**14.10** «Хвіліна славы. Мары спраўджваюцца!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Суботні «Ералаш».
**16.40** Прэм'ера. «Аляксандр Разэнбаум. «Мой дзіўны сон».
**17.40** Юбілейны фэст «Галосячы КіВіН».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здань оперы».
**22.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.50** Прэм'ера. Фільм «Памятай мяне».
**00.50** Камедыя «Спортлато-82».

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Фільм «Белае сонца пустэльні».
**12.40** Фільм «Красуня і мурзіла».
**14.10** «Хвіліна славы. Мары спраўджваюцца!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Ералаш.
**16.50** Прэм'ера. Камедыя «Назад у СССР».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здань оперы».
**22.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.50** Фільм «Запавет».
**01.00** Праграма «Ціхі дом» на Венецыянскім кінафэсце.

**07.10** «Анфас».
**07.25** «Гарачы лёд».
**07.55** Фільм «Пацалунак на поспех». ЗША, 2006г.
**09.40** «Чыстая праца».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.00** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.55** Фільм «Джэк Васьмёркін - «амерыканец». СССР, 1986г. 1-я серыя.
**15.15** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Не хачу жаніцца!». Расія, 1994г.
**19.30** «24 гадзіны».
**19.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «Нёман» Гродна - ФК «Дынама» Мінск. Прамая трансляцыя. У перапынку «СТБ-спорт».
**21.55** Фільм «Кароль камедыі». ЗША, 1982г.
**23.50** «Зорны рынг».
**00.45** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.50** Прыгоды Агента 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**08.55** Жансавет.
**09.30** Дача здароўя.
**10.10** Меладрама «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (СССР).
**12.15** Тэлебарометр.
**12.20** Дыялогі пра рыбалку.
**12.55** Серыял «Маргоша» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Астан-Віла - Ньюкасл.
**18.55** Халі-галі. Скетч-шоў.
**19.15** Камедыя «Беражыся аўтамабіля» (СССР).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Прыгоды Агента 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**23.20** Канцэрт «Anastasia. Live At Last».

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.10** «Звычайны канцэрт».
**07.40** Мультфільмы.
**07.55** «Крывое люстэрка».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Пясочны дождж». 2008 г.
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.45** Фільм «Вершнік без галавы».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Фільм «Палын - трава праклятая». 2010 г.
**22.30** Тэлесерыял «Даішнікі».
**00.30** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Іх норавы».
**09.30** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Руская сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**22.55** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**23.55** Вострасюжэтны фільм «Помста без права перадачы».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**10.15** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Дзень 2-і.
**11.45** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Дзень 2-і.
**14.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). Гонка 1-я.
**16.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Дзень 2-і.
**17.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/4 фіналу.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Тайланд - Еўропа. Германія.
**01.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/4 фіналу.
**02.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 2 серыя.
**08.35** «Між намі, бусламі», мультсерыял для дзяцей: 2 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.25** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**09.55** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.25** Без рэтушы: «Выбар Саннікава», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**10.50** «Расія. XX стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 2.
**11.20** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.45** Госць «Белсату».
**12.00** Форум (ток-шоу): «Вольныя СМІ ў несвабоднай краіне».
**12.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.15** «Між намі, бусламі», мультсерыял для дзяцей: 2 серыя.
**13.35** Калыханка для самых маленькіх.
**14.05** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**14.35** Госць «Белсату».
**14.50** «Парнаграфія», маст. фільм, 2003 г., Польшча.
**16.45** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.10** «Доктар Марцін», серыял: 2 серыя.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Генацыд армянаў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**19.00** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**19.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.30** Беларускія лёсы: «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.45** Суботні сеанс: «Коні і Карла», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
**23.25** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**00.10** Аб'ектыў.

## 18 ВЕРАСНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.40** Канцэрт «Залаты грамафон» (2007 г.).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.35** Відэафільм АТН «Мар'іна Горка» цыклу «Зямля беларуская».
**10.50** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна). Заключная серыя.
**12.10** Рамантычная драма «Рабыня кахання» (СССР).
**14.00** Час кіно.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.20** Прыгодніцкі баявік «Мальтыйскі крыж» (Расія).
**18.10** Суперлато.
**19.15** Камедыйны баявік «Таксі-4» (Францыя).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Меладрама «Фантомны боль» (Германія).
**23.40** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна). Заключная серыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**12.40** Фільм «Раманс аб закаханых».
**14.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**15.00** Прэм'ера «Выйшаў вожык з смугі».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.20** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.25** Фільм «Васабі».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. Камедыя.
**23.25** Фільм «Растуленыя абдымкі».

**07.00** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.55** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**08.20** Фільм «Курыца». СССР, 1991 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Джэк Васьмёркін - «амерыканец». СССР, 1986 г. Заключныя серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Стацкі дараднік». Расія, 2005 г.
**23.15** «Прафесійны бокс».
**00.10** Фільм «Чунгкінгскі экспрэс». Ганконг, 1994 г.
**01.55** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.55** Прыгоды Агента 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**09.05** «Правы чалавека». Аўтарская праграма.
**09.20** Дабравест.
**09.45** Свет вашай хаце.
**10.00** Тэлебарометр.
**10.05** Камедыя «Беражыся аўтамабіля» (СССР).
**11.55** Рэальны свет.
**12.30** «Страсці па культуры».
**13.15** Серыял «Маргоша» (Расія).
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Тотэнхэм- Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**17.25** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстар Юнайтэд-Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**19.55** «Смешная часіна».
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Прыгоды Агента 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**23.25** Драма «Гульня слоў» (ЗША).

**07.00** Фільм «Палын - трава праклятая». 2010 г.
**08.45** Тэлесерыял «Даішнікі».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Дзень сямейнай імпрэзы».
**13.30** «Смехапанарама».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** Прэм'ера. «Асцярожна, лазер!».
**15.35** «Рамантыка раманса».
**16.25** Фільм «Піраты ХХ стагоддзя».
**18.05** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Дуэль». 2011 г.
**22.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.55** Фільм «Калі бракуе кахання». 2008 г.

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.50** «Першая передача». Аўтамабільная праграма.
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Крамлёўскія дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** Прэм'ера. «Таемны шоў-бізнэс: Ала, дай мільён!».
**22.50** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**23.50** Вострасюжэтны фільм «Сёмая ахвяра».

**09.30** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/4 фіналу.
**11.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат Еўропы. Балгарыя.
**12.30** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/4 фіналу.
**13.30** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат Еўропы. Балгарыя.
**14.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). Гонка 2-я.
**16.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/2 фіналу.
**19.00** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат Еўропы. Балгарыя.
**20.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/2 фіналу.
**23.00** Мотаспартыўны часопіс.
**23.15** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы (Мадрыд, Іспанія).
**00.15** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат Еўропы. Балгарыя.
**01.15** Снукер. Мастэрс (Бразілія). 1/2 фіналу.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** На колах.
**07.40** Госць «Белсату».
**08.00** «Доктар Марцін», серыял: 2 серыя.
**08.45** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** «Генацыд армянаў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**10.35** ПраСвет.
**11.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**11.50** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**12.20** Два на два (тэледыскусія).
**12.45** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.15** «Сонечная дзіда», серыял: 3 серыя.
**13.40** Калыханка для самых маленькіх.
**14.10** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**14.30** «Доктар Марцін», серыял: 2 серыя.
**15.20** «Коні і Карла», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Акварыум», серыял, 1996 г., Польшча–Германія–Украіна: 1 серыя.
**18.10** Два на два (тэледыскусія).
**18.40** «Малая Міс Цыганія», дак. фільм, 2009 г., Харватыя.
**19.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Дакументальная гадзіна: «Марцін Лютэр Кінг. Смерць у Мэмфісе», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**20.30** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «Svet Boogie Band».
**20.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**22.00** Фільматэка майстроў: «Заўтра пойдзем у кіно», маст. фільм, 2007 г., Польшча.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

Для тых, хто прымае рашэнні!
Новы час
www.novychas.org

НАТАТКІ

# ЯК МЫ ВЫВУЧАЛІ ЗЯЛЁНУЮ КНІГУ

Алег НОВІКАЎ

**Разам з крахам рэжыму Кадафі, здаецца, знік Рух рэвалюцыйных камітэтаў (РРК) — інтэрнацыянал аматараў «Зялёнай кнігі». Прапаную вашай увазе нататкі заснавальніка беларускай секцыі РКК.**

Упершыню з Зялёнай Кнігай мне давялося сустрэцца ў пачатку 1990-х. Па інтэрнатах БДУ гуляў анекдот пра нейкага студэнта-прайдзісвета, які давёў лівійскаму ўраду пра тое, што беларусы з ранку да ночы прагнуць рэалізаваць на практыцы канцэпцыі Трэцяй сусветнай тэорыі. Адзінага ім быццам не хапае — дарожнай кнігі ў выглядзе публікацыі той самай «Зялёнай кнігі» па-беларуску. Лівійцы далі таму беларускаму Бэндэру грант на пераклад і друк.

Існаваў матэрыяльны доказ праўдзівасці гэтай аферы (калі яна сапраўды мела месца). У шапіку ТБМ, які знаходзіўся каля цэнтральных чыгуначных кас, сапраўды прадавалася «Зялёная кніга» на беларускай мове. Дзіўна, як дырэктар ТБМ Алег Трусаў дазволіў уключыць твор Муамара ў наменклатуру тавараў. Фаліянт, які заклікаў знішчыць прадстаўнічую дэмакратыю, быў выкладзены па суседству з мемуарамі вязняў ГУЛАГу і інструкцыямі «Што павінен рабіць сапраўдны беларус».

Прыкладна праз 7–8 гадоў тэма «Зялёнай кнігі» зноў вярнулася. Адзін вядомы кіеўскі трацкіст прапанаваў важную сустрэчу. У нейкай кулінарыі каля станцыі метро «Політэхнічная» ён раскрыў карты: трэба стварыць беларускую секцыю РКК у абмен на халяўныя семінары па вывучэнню «Зялёнай кнігі» ў Крыму. Толькі б дурань адмовіўся ад такой прапановы. Хутка на гістфаку БДУ нарадзілася група фанатаў «Зялёнай кнігі».

Праз нейкі час нас сапраўды павезлі ў Крым семінарыць. Фармат семінараў, якія праводзіліся ў актавай зале нейкай школы, быў просты. Спачатку лекцыі пра змест «Зялёнай кнігі». Пасля адказы на пытанні аўдыторыі.




Аднак аднойчы нешта абламалася, і з нашай дапамогай прыём арганізавалі ў бары «Йо-Йо», дзе звычайна збіраліся гомасэксуалісты

Лекцыі чыталі лівійскія прафесары з дыпломамі акадэміі па вывучэнню «Зялёнай кнігі». На пытанні адказвалі кіеўскія трацкісты, якія касілі пад знаўцаў вучэння Кадафі. Інакш было нельга. Пытанні былі вельмі каверзныя: як у Лівіі лечаць гомасэксуалістаў або чаму Кадафі забараніў жаночы спорт.

Семінары нам спадабаліся, паколькі лекцыі цягнуліся максімум пару гадзін. Астатні час мы валяліся на крымскіх пляжах. Больш таго, па выніках мерапрыемства нам падаравалі гадзіннікі з выявай палкоўніка. Чуткі пра халяву ў Крыму радыкальна пашырылі кола аматараў «Зялёнай кнігі» ў Беларусі.

І тут раптам прыйшла кепская навіна — у нас адчыняецца пасольства Лівіі. Негатыўны момант палягаў у тым, што па штату пры кожным пасольстве ёсць супрацоўнік, які адказвае за стан вывучэння «Зялёнай кнігі» ў краіне. Перспектыва кантролю нашай дзейнасці нас мала цешыла. Аднак куратарам да беларускага РКК прыставілі нейкага Ахмеда. Ён быў вясёлы чалавек, які любіў пасядзець з намі ў кампаніі і паглядзець футбол.

Менавіта Ахмед прынёс нам радасную навіну — беларусаў запрасілі ў Лівію. І мы паехалі. Першае, што ўразіла ў аэрапорце Трыпалі, інтэр'ер прыбіральняў. Замест паперы ўжываўся шланг, з якога ўвесь час цякла вада. Як след, іх WC нагадвалі кватэру, якую заліў п'яны сусед зверху. Другі цывілізацыйны шок выклікала татальная забарона на алкаголь. Зялёнакніжнікі з былога СССР кампенсавалі недахоп паленнем кальяну і беспаспяховымі спробамі выйсці на чорны алкагольны рынак. Распавядалі, што некаторыя нават спрабавалі рабіць брагу з кавуноў.

Што тычыцца самой Лівіі, то яна выглядала дастаткова спакойнай краінай з малой сацыяльнай дыферэнцыяцыяй. Складалася ўражанне, што тутэйшыя ўвогуле не цікавяцца палітыкай. Яны ў лепшым выпадку гундосілі пра тое, што ў краіне зашмат гастарбайтэраў з Егіпту і чорнай Афрыкі. (Кадафі надаў ім права працаваць у краіне без працоўнай візы). Кадафі сапраўды насіўся з Афрыкай. Секцыі РКК у афрыканскіх краінах нагадвалі не тусоўкі студэнтаў і анархістаў, а сур'ёзныя партыі, якія маглі пазмагацца за ўладу.

Беларуская РКК, натуральна, ні пра якую ўладу не думала. Перыядычна мы рабілі нейкія семінары. Квасілі з арабскімі студэнтамі. Рытуалам было святкаванне 1 верасня Дня зялёнай рэвалюцыі. У гэты дзень лівійскае пасольства рабіла вялікія фуршэты. Самым моцным напоем на такіх прыёмах быў нейкі журавінавы сок. Таму госці тайна праносілі ў залу пляшкі. Асабліва гучна гудзелі выкладчыкі вайсковай акадэміі. Памятаю, яны дасвяткаваліся да такой ступені, што нават зламалі стул.

Як правіла, фэсты на 1-га верасня адбываліся ў «Журавінцы». Аднак аднойчы нешта абламалася, і з нашай дапамогай прыём арганізавалі ў бары «Йо-Йо», дзе звычайна збіраліся гомасэксуалісты. Дыпламаты з Лівіі, дзе сэксуальныя меншасці, як было згадана вышэй, прымусова лечаць, падвоху не заўважылі. Беларуская група была на добрым рахунку ў Трыпалі. У 2008-м нашага прадстаўніка ўключылі ў склад дэлегацыі, якая асабіста сустракалася з Муамарам.

Так склалася, што актыўнасць беларускага РРК залежала ад асобы куратара. Пасля таго, як Ахмеда адклікалі ў Лівію, інтэнсіўнасць прапаганды Трэцяй сусветнай тэорыі ў краіне прытармазілася. Адказныя за працу з намі ўзгадвалі пра неабходнасць пашырэння вучэння Муамара вельмі рэдка, выключна тады, калі іх тармашылі з Трыпалі. Апошні раз у пасольстве прачнуліся прыкладна за тры месяца да пачатку арабскай вясны. Нас заклікалі рыхтавацца да правядзення відэа-мосту. Мы, беларускія фанаты «Зялёнай кнігі», павінны былі атрымаць гаранаровую магчымасць размаўляць з палкоўнікам. Аднак, як і сотні падобных праектаў, тэлемост застаўся выключна на паперы.

Паўстанне ў Бенгазі, здавалася, на нейкі момант кансалідавала РКК па ўсім свеце. Расійская і ўкраінская РКК заклікалі да кампаніі салідарнасці з урадам у Трыпалі. А нехта Васіль Точкін, фанатычны прыхільнік Кадафі з Масквы, нават паехаў ваяваць у Лівію. Апошні раз ён адгукнуўся з Тунісу. Аднак самі лівійцы ў пасольствах, у тым ліку куратары, вельмі асцярожна ўспрынялі ініцыятывы наконт кампаній салідарнасці. Было відавочна, што большасць супрацоўнікаў МЗС Лівіі хочуць проста перачакаць. Калі ў канфлікт умяшалася NATO, яны хутка забылі пра тое, што яшчэ ўчора называлі сябе вернымі кадафістамі і ўзнялі зялёна-чорна-чырвоны сцяг паўстанцаў.

Будучыня РКК у СНД і ў свеце цяпер выглядае дастаткова сумна. Аднак некаторыя лічаць, што не ўсё так кепска. Прынамсі таму, што залаты запас Лівіі зараз накіроўваецца ў Нігер, дзе Муамар Кадафі, па чутках, атрымаў палітычны прытулак.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Цяперашняя восень — яшчэ не канец. Але, з іншага боку, гэта ўжо і не пачатак канца. Проста становіцца відавочным, што сістэма дзяржаўнага кіравання, створаная ў Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, дайшла да стадыі, уласцівай шматлікім персаналісцкім рэжымам. Калі іх лідары не здольныя ні змяніцца ўнутрана, ні стварыць новыя ідэі, ні задумацца аб сыходзе, пачынаюць змагацца выключна за тое, каб яшчэ некалькі дзён, месяцаў ці гадоў заставацца ля ўлады.

**«Газета.Ру» (Расія)**

Патэнцыйную небяспеку бягучай сітуацыі разумеюць і ўлады Беларусі, якія мабілізавалі ўвесь свой медыйны рэсурс для барацьбы з «падбухторшчыкамі беспарадкаў». Па версіі афіцыйнай беларускай прапаганды, невялікі крызіс у краіне, можа, і ёсць, але ў ім вінаваты выключна ўрад, які не можа эфектыўна выканаць распараджэнні прэзідэнта Лукашэнкі. Выставіць вінаватымі службоўцаў за рашэнні, якія прымаў ён сам, — гэта звычайны стыль працы прэзідэнта Лукашэнкі. За апошнія паўгода ўлады краіны дапусцілі ў эканоміцы ўсе магчымыя памылкі, так што зараз абяцанні Аляксандра Лукашэнкі на працягу месяца выправіць сітуацыю выглядаюць абсалютнай хітрасцю.

**«Камерсант» (Украіна)**

Беларускі трафік туды (у газаправод «Паўночны паток»), хутчэй за ўсё, можна запампаваць, часткова скінуўшы ўкраінскі. Таму рашэнне так званага «паўночнага кірунку» — непрыемныя навіны для нашых беларускіх калегаў. Мабыць, таму адным з самых актыўных апанентаў «Паўночнага патоку» з'яўляўся прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

**НФМ (Расія)**

Па задуме ўладаў, ужо само абяцанне сустрэч за круглым сталом павінна прадухіліць пратэсты, якія плануе апазіцыя ў сувязі з рэзкім ростам коштаў. Народных хваляванняў Лукашэнка вельмі баіцца, паколькі падзеі могуць развівацца па некіраваным сцэнары аж да страты ім улады. Вось чаму заява прэзідэнта пра дыялог больш падобная на заклік «Ратуйце мяне!», чым на пачатак незваротнага працэсу дэмакратызацыі. Пакуль усё паказвае на тое, што ўладная эліта вядзе перагрупоўку сіл перад выбарамі ў парламент, якія пройдуць у 2012 годзе. Пры гэтым, нягледзячы на заклікі да дыялогу, улада не мае намеру падзяляцца паўнамоцтвамі з апазіцыяй і заклапочана праблемай уласнага выжывання любым коштам, нават калі для гэтага давядзецца сесці за стол перамоў з апанентамі і вызваліць усіх палітвязняў.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Беларусь адназначна ўспрымаецца міжнароднай супольнасцю як краіна-ізгой, дзякуючы рэжыму Лукашэнкі. Дыктатарскія рэжымы рознай ступені аўтарытарнасці, завязаныя на нязменных пажыццёвых кіраўнікоў дзяржаў — з такімі партнёрамі Расія не павялічвае сваёй палітычнай вагі і ўплыву ў свеце.

**«Газета.Ру» (Расія)**

У недахопе мяса ў крамах вінаватыя расіяне, якія яго купляюць у масавым парадку. Тое ж самае адбылося б і з антыбіётыкамі і віяграй, калі б у нас яны былі б не па рэцэптах, — пераконваюць землякоў мінскія ўлады. Улады гуляюць на ментальнасці беларусаў, якія яшчэ ў часы СССР былі перакананы, што яны кормяць усю Расію. Зараз Мінск абвінавачваннямі ў адрас Масквы спрабуе скінуць з сябе адказнасць за эканамічныя цяжкасці.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. 15 ГАДОЎ З ДНЯ ЎВЯДЗЕННЯ ГРЫЎНІ

2 верасня споўнілася 15 гадоў з таго часу, як украінцы перасталі быць мільянерамі: у гэты дзень у 1996-м пачаўся абмен купонаў-карбованцаў, намінал якіх дайшоў да 10 мільёнаў, на новыя ўкраінскія грошы — грыўні. Мянялі па курсе адзін да ста тысяч, гэта значыць за 100 000 карбованцаў давалі адну новенькую грыўню, што ў народзе празвалі гетманы (на купюрах было шмат выяваў украінскіх гетманаў). Адным з аўтараў рэформы быў Віктар Юшчанка, тагачасны дырэктар Нацбанку. Ён кажа, што сігналам для рэформы стала пабачаная ім сцэна ў адной з правінцыйных прыбіральняў, дзе наведвальнікам замест туалетнай паперы выдавалі купоны. Увядзенне новых грошай не абышлося без скандалаў. Так, невядома хто замяніў зацверджаны камісіяй партрэт Тараса Шаўчэнкі на купюры ў сто грыўняў, дзе ён быў у касцюме і без галаўнога ўбору, на яго хрэстаматыйны малюнак у выглядзе сельскага дзядзькі ў кажуху і барановвай шапцы. Другі скандал — мастака, які маляваў банкноты, абвінавацілі ў тым, што замест князёў Уладзіміра і Яраслава Мудрага ён намаляваў свой партрэт. У выніку партрэты ў 2004-м памянялі, дамаляваўшы князям бароды. Так ці інакш, грыўня прыжылася і лічыцца адносна стабільнай валютай у рэгіёне.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ПРАБЛЕМА РЭГІЯНАЛЬНЫХ МОЎ



Эва Жалі, кандыдат на пасаду прэзідэнта Францыі ад партыі Зялёныя, з першага дня сваёй кампаніі набыла рэпутацыю арыгінальнага палітыка. Хаця б таму, што яна нарвежка і атрымала французскі пашпарт дзякуючы шлюбу з французам. Ніколі ў гісторыі Францыі не было кандыдата ў прэзідэнты, які не меў ніводнай кроплі гальскай крыві. У дадатак Жалі ўвесь час кідае выклікі ўсім грамадскім стэрэатыпам і табу. Напрыклад, прапанавала адмяніць вайсковы парад на 14-е ліпеня. Падобнымі ініцыятывамі яна адразу нажыла сабе безліч ворагаў у асяроддзі нацыяналістаў і кансерватараў. Зараз яны яшчэ больш злыя, паколькі, па іх словах, Эва зрабіла замах на «нацыянальнае адзінства». Справа ў тым, што Жалі лічыць наяўнасць у Францыі толькі адной афіцыйнай мовы праявай «валявой гегемоніі». Як вядома, у Францыі малыя этнасы кшталту баскаў і брэтонцаў дамагаюцца надання сваім мовам статусу рэгіянальных насуперак пазіцыі афіцыйнага Парыжу. Кандыдат Зялёных паабяцала падтрымліваць рэгіянальныя мовы, якім пагражае знішчэнне. На думку правых партый, рэалізацыя ідэй Зялёных ператорварыць Францыю ў кангламерат напалову аўтаномных рэгіёнаў». А Нікаля Дзюк, дэпутат ад галісцкага «Саюзу за народны рух» (UMP), увогуле лічыць, што Эва Жалі — палітычны праект, сэнс якога «паставіць пад сумнеў усю канструкцыю нацыі, пабудаванаю папярэднімі генерацыямі».

**Па матэрыялах французскай прэсы**

### ЗША. ШТАТЫ СТАЛІ КАЛЯРОВЫМІ

Злучаныя Штаты як краіна, дзе большасць насельніцтва складаюць нашчадкі белых каланістаў, больш не існуе. З цяперашняга года белыя ў Штатах — меншасць. Пра гэта заявіла група амерыканскіх сацыёлагаў са спасылкай на дэмаграфічныя тэндэнцыі. Яны сыходзяць у тым ліку са статыстыкі, якая была апублікаваная ў мінулым годзе. Адпаведна ёй, у краіне сярод дзяцей менш за адзін год белых немаўлят было 50,2 працэнта, а немаўлят афрыканскага, лацінаамерыканскага і азіяцкага паходжання 49,8. У гэтым годзе, па словах навукоўцаў, гэтая магічная мяжа была пройдзеная. Праз 20 гадоў, калі тыя немаўляты стануць дарослымі, у краіне ўзнікне дамінаванне каляровых амерыканцаў. У прынцыпе, як сведчыць вопыт мясцовасцяў, дзе белыя даўно ў меншасці, нічога страшнага не будзе. Нагадаем, што ў Нью-Ёрку каляровыя пераважаюць яшчэ з 2000 года. Тая ж сітуацыя ў Вашынгтоне і Сан-Францыска. Як піша прэса, праблемы ад новых дэмаграфічных зменаў, калі і ўзнікнуць, то ў дакладна ў партыі рэспубліканцаў, якая традыцыйна працуе з белым электаратам.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### РАСІЯ. «АДЗІНАЯ РАСІЯ» ЗАСЫЛАЕ ТРОЛЯЎ У СЕЦІВА

У ЦВК партыі «Адзіная Расія» 25 жніўня прайшла зачыненая нарада з прадстаўнікамі рэгіянальных аддзяленняў, прысвечаная перадвыбарнай стратэгіі партыі ў інтэрнэце. На нарадзе была прызнана нездавальняльнай агульная сітуацыя з прадстаўніцтвам партыі ў сеціве. Як прыклад, група КПРФ у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» налічвае каля 70 тысяч «фрэндаў», а група сяброў «Адзінай Расіі» — 4200. Такое ж становішча склалася ў сетках «Аднакласнікі» і Facebook. Рэгіёнам рэкамендавалі павялічыць масавасць партыйных акаўнтаў у сацсетках. Аднак самым цікавым стала пытанне кваліфікацыі і інструктажу адмысловых каментатараў. Гаворка пра тролляў-адзінаросаў — спецыяльных каментатараў, якія мусяць пакідаць на форумах лаяльныя каментары на адрас улады. На нарадзе скардзіліся, што тролі «Адзінай Расіі» непераканаўчыя. У выніку было прынята рашэнне аператыўна «нарошчваць лік каментатараў і навучаць іх».

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

МЕРКАВАННЕ

# ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА ПА ЯНУКОВІЧУ

**Ва Украіне афіцыйна названая дата парламенцкіх выбараў — 28 кастрычніка наступнага года. Яе фонам дакладна стане пачатая па ініцыятыве Партыі рэгіёнаў перазагрузка партыйнага поля. Пра сітуацыю ва Украіне журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з украінскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**



***— Што ўяўляе сабой партыйная схема Украіны?***

— Сучасная мадэль расстаноўкі партый сфармавалася напярэдадні аранжавай рэвалюцыі, у час вялікай палярызацыі грамадства на прыхільнікаў аранжавых і бела-блакітных. Пазней гэта вендэта набыла асабісты характар: Юлія Цімашэнка супраць Віктара Януковіча. Аднак цалкам падобнай на амерыканскую двухпартыйнай сістэмы ў нас не склалася. Абсалютнага дамінавання атрымаць нікому не ўдалося. Некаторыя партыі — нацыяналісты, камуністы і цэнтрысты — захавалі невялікія, аднак сталыя электаральныя базы. У гэтай сітуацыі партыі-гуліверы вымушаны былі шукаць кампраміс з ліліпутамі. Добрай ілюстрацыяй з'яўляецца цяперашні склад ураду. Гэта салянка з Партыі рэгіёнаў, камуністаў, цэнтрыстаў Літвіна і цігіпкаўцаў з партыі «Моцная Украіна» (СУ).

***— Нашто Партыі рэгіёнаў мяняць гэтую схему напярэдадні выбараў?***

— Перш за ўсё з-за таго, што Партыя рэгіёнаў з-за сваёй сацыяльнай палітыкі ўжо страціла стабільную падтрымку з боку 35–40 працэнтаў электарату. Як правіла, гэта ўсходнія і паўднёвыя рускамоўныя рэгіёны. Рэйтынг Януковіча зараз не выходзіць за рамкі 9,7 працэнтаў (дадзеныя Цэнтра Разумкова). Гэта фантастычная лічба. Атрымліваецца, што Віктар Фёдаравіч губляе папулярнасць больш хуткімі тэмамі, чым Віктар Юшчанка, які лічыцца архетыпам слабага прэзідэнта. Юшчанка так нізка ўпаў толькі на трэці год прэзідэнцтва. Каб выкарабкацца з рэйтынгавай ямы і перамагчы на выбарах, вырашана пашырыць групу падтрымкі Партыі рэгіёнаў шляхам стварэння на базе ПР мегапартыі. Дарэчы, гэта не ноў-хаў. Менавіта так паступіў Кучма, калі на выбарах 2002-га стварыў кааліцыю «За адзіную Украіну». Рабіцца кансалідацыя будзе шляхам банальнага пажырання шэрагу малых партый цэнтру. Ёсць першыя ахвяры. Сяргей Цігіпка, які спрабаваў стварыць свой варыянт партыі рускамоўнай часткі Украіны, абвясціў пра пераход яго структуры ў Партыю рэгіёнаў.

***— Хто яшчэ, акрамя «Моцнай Украіны», можа стаць ахвярай праекту мегапартыі?***

— Безумоўна, Уладзімір Літвін і яго Народная партыя, а таксама, магчыма, Сацыялістычная партыя Украіны (СПУ). Першы ўжо даў зразумець, што вядзе перамовы наконт аб'яднання. Што тычыцца сацыялістаў, то нядаўняе выключэнне партыі са складу Сацінтэрну само штурхае іх шукаць новы ідэйны полюс. Вядома, што нядаўняе вяртанне Александра Мароза на пасаду старшыні СПУ падтрымаў шэраг бонзаў Партыі рэгіёнаў.

***— Большасць украінскіх партый — лідарскія, а не ідэйныя партыі. Рэдкае выключэнне — камуністы. Які лёс чакае партыю Сіманенкі ў кантэксце змянення партыйнага ландшафту, задуманага Партыяй рэгіёнаў?***

— Камуністы ў крызісе. Іх кіраўніцтва асабіста, магчыма, не супраць прыяднацца да мегапраекту Партыі рэгіёнаў, аднак нашто яны патрэбныя Януковічу? Усім зразумела, што пенсіянеры-сталіністы не будуць галасаваць за Партыю рэгіёнаў (партыю алігархаў). Таму зараз камуністы схіляюцца да таго, каб пачаць ледзь не псіхічную атаку на ўладу. Вядома, што хутка яны выставяць спіс прэтэнзій да ўраду. Паколькі камуністы самі ўваходзяць ва ўрад, цяжка сказаць, наколькі ім гэта дапаможа. Зараз цалкам рэальна, што КПУ ўпершыню не трапіць у Вярхоўную Раду.

***— Чаму малыя партыі пагаджаюцца на прымусовую інкарпарацыю?***

— Часткова працуюць суб'ектыўныя фактары. Як вядома, Сяргей Цігіпка зараз мае някепскія шанцы атрымаць партфель прэм'ера. Ну, гэта пернік. Што да пугі, то ёй з'яўляецца план хуткай рэформы выбарчага заканадаўства. На наступных выбарах будуць мажарытарныя ўчасткі, прахадны бар'ер, хутчэй за ўсё, будзе ўзняты да пяці працэнтаў, што значыць палітычны карачун для партый другога эшалону. Акрамя таго, актыўна дыскутуецца ідэя «джэрымендэрынгу». Кажучы на нармальнай мове — выбарчыя ўчасткі будуць рэзаць такі чынам, каб падарваць электаральныя базы праціўніка. Існуе нават фантастычная прапанова — нарэзаць іх такім макарам, каб адна частка ўчастка была з Заходняй, а другая — з Усходняй Украіны.

***— Як сам актыў малых партый успрымае інфармацыю пра сепаратныя перамовы іх кіраўніцтва з Партыяй рэгіёнаў?***

— Пакуль пра гэта мы можам меркаваць на прыкладзе «Моцнай Украіны», дзе працэс паглынання набыў прававы фармат: названа папярэдняя дата партыйнага сходу, на якія будзе вынесены праект рэзалюцыі аб роспуску партыі. Ініцыятыва лідара, мякка кажучы, сярод моцных украінцаў не была ўспрынятая на ўра. Партыя Цігіпкі ішла на выбары як партыя, альтэрнатыўная Партыі рэгіёнаў. Аляксандр Кужэль, другі чалавек у партыі, сказаў, што сябрам ПР ён дакладна не будзе. Таму можна казаць, што калі СУ і ўвойдзе ў ПР, то ў нейкім разабраным стане. Добрая частка партыі будзе шукаць новую нішу.

***— Атрымліваецца, што працэс паглынання малых партструктур выклікае ўнутрыпартыйныя раскол, якім можа скарыстацца лагер апазіцыі?***

— Праблема ў тым, што за апазіцыя? Адным з галоўных пунктаў плану перамогі на выбарах ёсць праблема Цімашэнка. Трэба максімальна паслабіць найбольш радыкальнага канкурэнта. Працэс над Цімашэнкай, яе нядаўні арышт, утрыманне ў СІЗО з'яўляюцца часткай рэалізацыі гэтага плана. Другая частка — кланіраванне партыі «Бацькаўшчына». Трэба чакаць з'яўлення жмені партый — спарынг-партнёраў, якія будуць гуляць на сюжэце палітычных рэпрэсій. За кошт гэтага будзе ісці размыванне электарату БЮТ. Трэцяя частка — выкарыстанне рэсурсу мажарытарных выбараў. На адным і тым жа ўчастку могуць змагацца фармальна пазапартыйныя кандыдаты. Аднак пасля атрымання мандатаў, яны будуць у фракцыі Партыі рэгіёнаў. І, нарэшце, апагей рэалізацыі плану 2012-га — стварэнне партыі мяккай апазіцыі, «Бацькаўшчына-лайт», якая негалосна будзе фінансавацца Партыяй рэгіёнаў.

***— Хто можа прэтэндаваць на такую адказную ролю?***

— Калі верыць аўтарытэтнаму выданню «Украінская Праўда», наладзіўся дыялог паміж лідарам партыі Арсенем Яцэнюком, лідарам партыі «Фронт зменаў», і Рынатам Ахметавым, галоўным спонсарам Партыі рэгіёнаў. Прычым, калі верыць таму ж выданню, сярод Партыі рэгіёнаў ёсць нават думка інвеставаць у Яцэнюка як патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты. Шансы Януковіча на пераабранне на другі тэрмін зараз вельмі ілюзорныя. Аднак у такім выпадку Яцэнюк будзе гуляць па правілах Партыі рэгіёнаў, заўжды памятаючы пра лёс Юліі Цімашэнка, без моцнай крытыкі на адрас алігархаў.

***— Ці магчыма, што Украіна атрымае бела-блакітны парламент?***

— Пакуль цяжка сказаць. Зразумела толькі тое, што гэта будуць вельмі брудныя выбары. Уладзе не да чысціні.

ІНІЦЫЯТЫВА

# ВЯРТАННЕ Ў КАНСТАНЦІНОПАЛЬ

Алег НОВІКАЎ

**У Абхазіі заснавана ініцыятыва за стварэнне Абхазскай праваслаўнай царквы, адначасова незалежнай і ад Масквы, і ад Тбілісі.**



Напрыканцы жніўня ў Абхазіі абіралі прэзідэнта. Ім стаў былы віцэ-прэзідэнт Аляксандр Анкваб. Зараз у экспертных колах спрачаюцца, якімі будуць пры Анквабу стасункі Масквы і Сухумі. Большасць лічыць, што абхазцы будуць шукаць нейкія варыянты пазбавіцца статусу сатэліта Масквы.

Адначасова адбылася іншая падзея — менш глабальная, аднак вельмі цікавая. Група абхазскіх праваслаўных святароў абвясціла пра стварэнне Святой мітраполіі Абхазіі. Па сутнасці, гутарка пра стварэнне аўтакефальнай праваслаўнай царквы, якая можа быць падпарадкаванай Канстанцінопальскаму патрыярхату.

Ініцыятыва наконт стварэння мітраполіі стала рэакцыяй на сітуацыю, якая склалася ў жыцці праваслаўнай абхазскай грамады.

Мясцовыя праваслаўныя даўно выказваюць гарачае жаданне ўвайсці пад патранаж Масквы. Здаецца, жаданне цалкам лагічнае з улікам таго, што менавіта РПЦ арганізуе абрад пасвячэння мясцовых клірыкаў у сан і дае абхазскім праваслаўным братам фінансавую і эканамічную дапамогу. Прэса нават піша, што Абхазія стварае аддзяленне РПЦ у Майкопе.

Такая сітуацыя мае акрамя таго гістарычны падмурак. Падчас існавання незалежнай Грузінскай Дэмакратычнай Рэспублікі (1918–1921) мясцовыя праваслаўныя царквы былі вымушаны пад ціскам новых уладаў прызнаць, што дзейнічаюць на кананічнай тэрыторыі Грузінскай Праваслаўнай Царквы (ГПЦ).

Частка сяброў расійскага праваслаўнага кліру адмовілася падпарадкоўвацца Тбілісі. Нават мела месца спроба заснаваць нешта накшталт катакомбнай секты. Канфлікт паміж цэрквамі з-за Абхазіі працягваўся нават пасля таго, як Грузія ўвайшла ў склад СССР.

Канчатковую кропку ў канфлікце РПЦ і ГПЦ вакол канфесіянальнай прыналежнасці Абхазіі паставіў геніяльны таварыш Сталін. У 1943 годзе РПЦ прызнала, што Абхазія — кананічная тэрыторыя Грузінскай Праваслаўнай Царквы. Дэ-юрэ гэты статус захаваўся і зараз, хаця ў рэальнасці ніякага ўплыву на жыццё абхазскіх праваслаўных грузінскі каталікос не мае.

У 1993 годзе мітрапаліт Данііл (Датуашвілі), біскуп Грузінскай Царквы, з прычыны паразы Грузіі ў грузіна-абхазскім канфлікце пакінуў Сухумскую епархію. Яго месца заняў пратаіерэй Вісарыён, які ўступіў на пасаду настаяцеля Сухумскага кафедральнага сабора, прыняўшы адначасова на сябе пасаду часовага кіраўніка епархіі. Ён таксама паспрабаваў наладзіць адносіны з Маскоўскім Патрыярхатам, у сувязі з чым некалькі разоў неафіцыйна сустракаўся з Патрыярхам Алексіем ІІ. Хаця таксама неафіцыйна Вісарыён сустракаўся і з каталікосам Грузіі, стратэгічны выбар быў зроблены на карысць Масквы.

15 верасня 2009 года на пазачарговым Епархіяльным з'ездзе ўсяго духавенства Абхазіі былі прыняты наступныя рашэнні: абвясціць пра спыненне дзейнасці Сухума-Абхазскай Епархіі Грузінскай Праваслаўнай Царквы на тэрыторыі Рэспублікі Абхазія. Абвясціць пра стварэнне Піцундскай і Сухумскай Епархіі Абхазскай Праваслаўнай царквы. Унесці адпаведныя змены ў Статут Епархіі. Падрыхтаваць адпаведны зварот да патрыярха Маскоўскага і ўсёй Русі Кірыла, Святому сіноду Рускай праваслаўнай царквы — з малітоўнай просьбай у аднаўленні Абхазскай праваслаўнай царквы, якая спыніла сваё існаванне ў 1795 годзе.

Натуральна, грузіны былі супраць. Каталікос усёй Грузіі Ілія ІІ заявіў: «Дадзенаю заяву мы не павінны ўспрымаць сур'ёзна, бо ні ў каго няма права аб'яўляць незалежнасць ад роднай Царквы».

Парадаксальна, аднак пералічаныя ініцыятывы абхазцаў таксама не выклікалі эйфарыі ў Маскве. 24 кастрычніка 2009 года Маскоўская патрыярхія заявіла пра непарушнасць межаў юрысдыкцыі Грузінскай Царквы, падкрэсліўшы, што, на яе меркаванне, у Абхазіі няма расколу: «Нягледзячы на змену палітычных межаў, мы па-ранейшаму лічым Абхазію часткай кананічнай тэрыторыі Грузінскай Праваслаўнай Царквы. Аднак мы бачым, што дэ-факта Грузінская Праваслаўная Царква там цяпер прысутнічаць не можа: ніводны грузінскі біскуп ці святар не мае магчымасці прыехаць у Абхазію. Значыць, мы павінны дапамагчы ажыццяўляць пастырскую дзейнасць змешчаным там кананічна пасвечаным абхазскім святарам. Мы павінны дапамагчы ім здабыць хоць бы часовы кананічны статут», — гаварылася ў заяве.

Асцярожнае стаўленне РПЦ да абхазскіх прапаноў тлумачыцца вельмі проста. Парушэнне РПЦ прынцыпу кананічнасці тэрыторый стварае прэцэдэнт. Ім могуць скарыстацца прыхільнікі аўтакефаліі ўкраінскай праваслаўнай царквы.

Такі прагматычны выбар Масквы і спыніў ініцыятыву па стварэнні новай незалежнай абхазскай царквы. Пры гэтым аўтары праекты Святой мітраполіі спасылаюцца на тое, што першапачаткова заснаваная ў VII стагоддзі Абхазія епархія была філіялам Антыахійскага патрыярхату.

У час існавання Абхазскага царства Антыохія нават дала згоду на тое, каб абхазцы мелі біскупа. Праўда, цяжка сказаць, ці быў гэты біскуп выключна абхазскі, паколькі ў склад абхазскага царства ўваходзіла Заходняя Грузія. Абхазская аўтакефалія закончылася ў 1795 годзе, калі апошні каталікос з-за канфлікту з грузінскім царом збег у Кіеў. Так ці інакш, як бачым, фармальна абхазскі каталікос быў часткай візантыйскай праваслаўнай царквы, а не РПЦ.

Менавіта грэчаскі характар абхазскага праваслаўя падкрэслівае стваральнік Святой Абхазскай Мітраполіі. Як піша прэса, пакуль не вядома, хто стаіць за «грэчаскім» праектам, аднак патэнцыял у яго ёсць. Абхазская кіраўніцтва паступова так ці інакш сыходзіць з-пад кантролю Расіі. І стварэнне сваёй аўтаномнай царквы было б моцнай падтрымкай. У сваю чаргу, Усяленскі патрыярхат — канстанцінопальская царква, відавочна будзе рады новай пастве.

**Асцярожнае стаўленне РПЦ да абхазскіх прапаноў тлумачыцца проста. Парушэнне РПЦ прынцыпу кананічнасці тэрыторый стварае прэцэдэнт. Ім могуць скарыстацца прыхільнікі аўтакефаліі ўкраінскай праваслаўнай царквы**

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ФІДЭЛЬ КАСТРА



Нечакана па Кубе зноў пачалі гуляць чуткі пра тое, што Фідэль памёр, а ўлады не ведаюць, як пра гэта інфармаваць насельніцтва, каб не выклікаць масавых акцый. Дарэчы, апошні раз Фідэля Кастра бачылі на публіцы ў красавіку падчас кангрэсу Кампартыі. З таго часу ён адгукаўся выключна праз публікацыі на старонках партыйнага органа «Granma». Аднак апошняя яго «рэфлексія» — так называецца яго рубрыка — пабачыла свет аж 3 ліпеня. Гэта вельмі падазрона, паколькі за гэты час у свеце адбыўся шэраг важных падзей, якія не маглі не трапіць у фокус інтарэсу правадыра, напрыклад, крах рэжыму Кадафі. Усе апісаныя загадкі рана ці позна мусілі матэрыялізавацца ў газетныя качкі, што і адбылося. 5 верасня «Nuevo Herald de Miami», якая выходзіць у Фларыдзе, заявіла, што «маўчанне Кастра ставіць пытанне — ці жывы ён?». Афіцыйная Гавана ў сваю чаргу паведамляе, што ён жывы. Аднак відавочна: кубінскія ўлады яўна нервуюцца. Стала вядома, што апошнім часам на востраве прайшоў шэраг арыштаў дысідэнтаў. Некаторым замежным журналістам таксама адмоўлена ў кубінскай візе. Пакуль не вядома, ці звязаныя гэтыя падзеі са станам здароўя Фідэля Кастра.

### ІВАН АХЛАБЫСЦІН



Актор папулярнага расійскага серыялу «Інтэрны», фармальна дасюль святар Рускай Праваслаўнай Царквы (РПЦ), на мінулым тыдні заявіў пра намер пайсці ў наступным годзе на прэзідэнцкія выбары. Калі меркаваць па статыстыцы, гэтая навіна найбольш дыскутуецца ў расійскім грамадстве. Натуральна, ніхто не абмяркоўвае шансы Ахлабысціна. У яго напэўна не будзе грошаў і сродкаў, каб арганізаваць збор подпісаў на месцах і стварыць выбарчы штаб. Таму для большасці аналітыкаў заява артыста — звычайны піяр. Аднак гэты піяр можа ўнесці карэктывы ў будучую кампанію. У рунэце называюць наступствы выхадкі Ахлабысціна — наданне расійскай палітыцы іміджу чагосьці несур'ёзнага, што паўплывае на давер насельніцтва да электаральнага працэсу. Прагноз — адбудзецца кампраметацыя імперскай ідэі і царквы: у вуснах актора маналогі пра неабходнасць рэстаўрацыі Расійскай імперыі і місію праваслаўя хутчэй выглядаюць камічна. Тыя, хто лічыць, што Ахлабысціна завербаваў Крэмль, кажуць, што яго задача ў тым, каб адрадзіць інтарэс да выбараў сярод моладзі, якая лічыць яго культавым акторам. У любым выпадку, усе пагаджаюцца, што з'яўленне ў палітыцы блазна Івана Ахлабысціна падарве пазіцыі Уладзіміра Жырыноўскага, вядомага сваім эксцэнтрычнымі паводзінамі.

### АНГЕЛА МЕРКЕЛЬ



Канцлер ФРГ, лідар Саюзу хрысціянскіх дэмакратаў, замацавала папулярны сярод немцаў тэзіс пра тое, што ёй час ісці на пенсію. Яна не здолела дапамагчы сваёй партыі добра выступіць на зямельных выбарах на радзіме — зямлі Мекленбург—Пярэдняя Памеранія. Нягледзячы на тое, што Меркель падчас кампаніі проста не вылазіла адсюль, кансерватары прайгралі. Па выніках галасавання, якое адбылося 4 верасня, у CDU толькі 23 працэнты (амаль на 5 працэнтаў менш за папярэднія выбары). А лібералы (партнёр CDU) увогуле не трапілі ў парламент. Перамаглі ж сацыял-дэмакраты, якія маюць 36 працэнтаў. Безумоўна, слабы давер да партыі Меркель звязаны з эканамічнай сітуацыяй у зямлі. Тут 12 працэнтаў беспрацоўных. Аднак, магчыма, правал звязаны са зменамі ў соцыуме. Сюрпрызам выбараў стаў поспех Зялёных, якім ніколі не ўдавалася прайсці ў мясцовы парламент. Зараз яны нечакана атрымалі аж 8,4 працэнта. У гэтым плане палітолагі кажуць, што выбары ў Мекленбургу з'яўляюцца гістарычнымі. Зялёныя — партыя феміністак, абаронцаў жывёл і багемы, становіцца масавай партыяй у землях былога ГДР, дзе жыве шмат «саўкоў» і неанацыстаў. Апошнім, дарэчы, таксама ўдалося атрымаць парламенцкія мандаты, хаця давер да іх скараціўся на два пункта (за іх галасавалі 5,4 працэнта выбаршчыкаў замест 7 працэнтаў на мінулых выбарах).

ЛЁСЫ

# ЛІНІІ ЛЕАНІДА ЗЛОТНІКАВА

АЛЯКСАНДР ТАМКОВІЧ

**На своеасаблівыя лініі сваё жыццё ўмоўна падзяліў сам Леанід Злотнікаў. Спачатку мне гэта падалося крыху экзатычным, а потым зразумеў, што інакш вядомы эканаміст папросту не мог. Эканоміка патрабуе ад чалавека абсалютнай дакладнасці.**



## Дзіцяча-школьная лінія

Нарадзіўся я 14 снежня 1939 года ў Гомелі. Маці, Любоў Усцінаўна, прыехала туды маладой дзяўчынай і працавала поварам у сталовай. Бацька, Канстанцін Данілавіч, вучыўся ў лесатэхнічным інстытуце. Пад Гомсельмашам была такая вёска — Ціценкі. Палову яе складалі Злотнікавы. Зараз гэта горад, таму майго бацьку, у нейкім сэнсе, можна лічыць «гарадскім».

Па размеркаванню яго накіравалі ў маленькі гарадок Балехаў Львоўскай вобласці, дзе знаходзіўся дрэваперапрацоўчы камбінат. 1940 год. Мясцовыя бабулі падбілі маю маці на хрост. Праваслаўнай царквы там не было, і мяне ахрысцілі ў касцёле. Так я стаў каталікам.

Калі пачалася вайна, сям'я тэрмінова вярнулася ў Гомель. У бацькі была адтэрміноўка ад службы, але ён туды папрасіўся добраахвотнікам. Загінуў у 1943 годзе недзе на Курскай Дузе, «прапаў без звестак». Нават магілы (каб ускласці кветкі) няма.

Дзявочае прозвішча маці — Драбышыўская. Яе радавая вёска складалася з хутароў. Зараз яна называецца Васільева. Гэта паміж Лоевам і Рэчыцай. Левы бераг Дняпра, да рэчкі чатыры кіламетры. Лес, балоты, як кажуць, на тыя землі не трапляла нага чалавека. Дарэчы, мае першыя дзіцячыя ўспаміны звязаны менавіта з тымі мясцінамі. Хаця да Гомеля было ўсяго 35 кіламетраў, людзей там жыло даволі мала. Падступы да беларускага Палесся.

Там я навучыўся плаваць. Так добра, што пазней, калі пасля вайсковай службы працаваў на Гомсельмашы, нават заняў трэцяе месца ў Гомелі. А потым на абласной спартакіядзе — першае месца па плаванню брасам на 200 метраў. Абсалютна без трэніровак.

У сям'і маці (як і бацькі) было шасцёра дзяцей. Яна адзіная дзяўчынка. Так што я меў па яе лініі пяцёра дзядзькаў. Самы малодшы з іх старэйшы за мяне толькі на пяць гадоў. Паколькі бацькі не стала вельмі хутка, выхоўваўся я менавіта там.

Маці больш не выйшла замуж — доўгія гады чакала вяртання з вайны свайго мужа.

Як узнікла вёска Васільева? Падчас Сталыпінскай рэформы бацька маёй маці купіў там 70 дзесяцінаў зямлі. Я нават бачыў тую «купчую», але потым бабуля яе схавала, бо баялася, каб не даведаліся ўлады, — сталінскія часы. Нейкім цудам дзеда не раскулачылі, бо за часамі калектывізацыі там не было вёскі. Адны хутары. Потым іх аб'ядналі, але розніца нейкай самаідэнтыфікацыі паміж людзьмі засталася. «Хутаране» лічылі сябе «шляхтай». Помню, у дзяцінстве мне казалі — не выцірай нос рукавом, будзеш як сяляне з суседняй вёскі.

Дарэчы, мясцовыя могілкі пачаў мой дзед Усцін і там жа пахаваны прадзед Сцяпан Кірэевіч, а яго жонку звалі Марыя Лявонцьеўна Багдановіч. Яна паходзіла з таго самага раёна (зараз Буда-Кашалёўскі), дзе быў маёнтак і сям'і паэта Максіма Багдановіча. Магчыма, мы з ім таксама далёкія сваякі.

У вёсцы Васільева зараз ніхто не жыве, людзі наведваюць яе толькі на Радаўніцу ды прыязджаюць на летні адпачынак.

Перад тым, як паступіць у лесатэхнічны інстытут, мой бацька працаваў на Гомсельмашы. Там зараз перад уваходам гарыць «вечны агонь» у памяць пра загінулых супрацоўнікаў, а на граніце выбіта прозвішча бацькі. Заўсёды схіляю галаву.

Пачынаў вучыцца (1946 год) у вёсцы Васільева. У тых мясцінах падчас вайны ішлі моцныя баі, таму зброі і розных выбуховых рэчаў хапала. Накідаеш у касцёр патронаў. Схаваешся за дрэва, а яны — бух-бух-бух. Памятаю, аднойчы ў суседняй вёсцы было вяселле. Побач з домам, які стаяў каля лесу і дзе праходзіла свята, нашы хлопцы (для жартоўнага салюту) узарвалі супрацьтанкавую міну. На стале ўсё пападала…

А яшчэ быў такі выпадак. У ім браў удзел і мой дзядзька. Яны навучыліся страляць з кулямёта, прыцягнулі яго ў школу і вырашылі напалохаць настаўніцу, якую вельмі не любілі. Паставілі кулямёт на парту, і калі яна зайшла, далі чаргу над галавой… Настаўніца была бялей за тую тынкоўку, што пасыпалася на галаву…

Некалькі разоў амаль не загінуў. Абодва — падчас вайны. Хата ў нас была вялікая, таму немцы размясцілі там свой штаб. А нас выгналі жыць у лазню, якая месцілася на ўскрайку лесу. 1943 год. Аднойчы немцы тэрмінова ўсіх сабралі. Нешта гамонячь па-свойму — газы, газы… Маўляў, нехта з хатніх па загаду партызанаў распаўсюдзіў у доме ядавітыя газы. Усіх адразу паставілі «да сценкі». Ледзь не расстралялі.

Гэта былі не эсэсаўцы, а звычайныя салдаты, таму яны часта частавалі мяне рознымі рэчамі. Тады было нешта з сухім перцам. Яго я і кінуў на вуглі «камянка». Адсюль — пах. Дзякуй Богу, бабуля патлумачыла гэта «на пальцах» і выратавала нам жыццё.

Другі раз звязаны з тым, што мяне з маці спрабавалі «адправіць» у Германію, але наш абоз пачала бамбіць савецкая авіяцыя. Уцяклі ў лес і жылі там да вызвалення. Елі ўсё, што знаходзілі. Памятаю, як аднойчы ў прыцемках варылі нейкі грыбны суп, а немцы ехалі па лясной дарозе. Убачылі касцёр і пачалі страляць. Кулі свісталі на галавой, а агонь залілі тым супам. І зараз стаіць перад вачамі, як шыпела наша ежа…

## Студэнцкая лінія

Школу скончыў амаль «круглым троечнікам». Адзіная пяцёрка ў маім атэстаце — геаграфія. Асабліва эканамічная. Любіў разбірацца, чаму адны краіны жывуць лепш за астатніх, як там арганізавана вытворчасць, эканамічныя адносіны і г.д. Мне было гэта цікава ўжо з дзяцінства.

Пасля школы (дзесяць класаў) адразу пайшоў у лесатэхнічны тэхнікум, дзе вучоба пайшла «ўвысь». Практыку праходзіў у леспрамгасе ў Столінскім раёна. Упершыню там сутыкнуўся з тым, што ў нас яшчэ захаваліся выспы патрыярхальнага жыцця.

Калі закончыў тэхнікум, вырашыў не ісці па гэтаму шляху, а працягнуць адукацыю ў іншай галіне. Ад размеркавання нейкім чынам «адмазаўся» і пайшоў працаваць рознарабочым у Гомельскія транспартна-рамонтныя майстэрні.

Радыётэхнічная справа мне падабалася больш «лясных спраў», і я падаў дакументы ў вайсковае вучылішча з такой спецыялізацыяй, якое тады стаяла пад нашым горадам. Іх прынялі, але на час, калі было трэба здаваць іспыты, яго перавялі ў Краснаярск. Паехаў туды. Паступіў.

Праз пэўны час зразумеў, што чалавек я па натуры свабодалюбівы і не хачу быць афіцэрам, таму напісаў рапарт з просьбай аб адлічэнні. Цэлы месяц яго не разглядалі, а прымушалі хадзіць на заняткі. Сядзеў і дэманстратыўна нічога не канспектаваў, не адказваў на пытанні настаўнікаў. Урэшце мяне адлічылі.

І адразу накіравалі служыць «тэрміновую». Паўгады вучобы не залічылі, таму давялося аддаць краіне яшчэ тры гады, бо тады на сушы служылі менавіта столькі.

Наш аэрадром месціўся каля Канску, гэта паміж Іркуцкам і Краснаярскам, быў аператарам радыёлакацыйнай станцыі авіяпалку знішчальнай авіяцыі.

Зампаліт да нас прыйшоў «па залёту» з танкавых частак. Памагаў яму весці палітзаняткі, бо той вельмі слаба арыентаваўся ў элементарных тэрмінах. Пазней ён прапанаваў уступіць у КПСС. Я адказаў, што падзяляю іх ідэі, але быць з ім асабіста ў адной партыі не хачу… На «губе» (гаўптвахта) давялося адсядзець амаль месяц.

Мастацкую літаратуру туды браць не давалі, а грамадска-палітычную — калі ласка. Прыйшлося чытаць нейкі «дыялектычны матэрыялізм» альбо «палітэканомію». І рабіў гэта з задавальненнем.

Пасля вайсковай службы вярнуўся ў Гомель. Уладкаваўся на Гомсельмаш. Спачатку вучнем слесара, а потым атрымаў кваліфікацыю. Працаваў і ў інструментальным цэху, а затым (каб больш зарабляць) пайшоў слесарам у цэх шэрага чыгуну. Грукат, гарачыня.

Як я ўжо казаў, там хутка трапіў у спартовую каманду па плаванню і жыццё заўважна змянілася — зборы, талоны на ежу ў абкамаўскай сталовай. Сапраўдны прыліў жыццёвай энергіі. Вырашыў паступаць у Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт (МДУ). Выбраў эканамічны факультэт, дакладней палітэканомію.

На «абітуры» лёс пасяліў мяне ў адзін блок з матэматыкам. Васіль Васільевіч Жыхаў паступаў у аспірантуру. Ён і расказаў, што на «маім» факультэце ўжо другі год працуе аддзяленне эканамічнай кібернетыкі. Профільным прадметам там была матэматыка, а я, калі рыхтаваўся да паступлення, не абсалютна не рыхтаваў. Гэта сур'ёзна «напружвала».

Ён правёў некалькі тэстаў, каб высветліць мае матэматычныя здольнасці. Застаўся давольным і параіў да першага экзамену зразумець толькі сутнасць тэарэм, каб выкарыстаць іх для рашэння задач. Так я зрабіў, і за дзень да сканчэння адпаведных тэрмінаў з «палітэканоміі» аднёс туды свае дакументы.

Праз чатыры дні я здаў пісьмовую матэматыку. На пяць балаў. То ж самае было і з вуснай матэматыкай. Экзамен у мяне прымаў вядомы алгебраіст Юрый Мікалаевіч Цюрын, які напісаў па гэтай тэме шмат кніжак. Ён быў моцна ўражаны тым, што я даказаў правільна нейкую тэарэму не так, як гэта было ў падручніку. Прыдумаў доказ сам. І, нягледзячы на конкурс у 18 чалавек на адно месца, паступіў.

Лібералам па духу я стаў прыблізна на пятым курсе, таму што за паўгода да гэтага нашу кафедру па гаспадарчай дамове прыцягнулі да практычнай работы па стварэнню аўтаматызаванай сістэмы планавых разлікаў Дзяржплана СССР, і мне даводзілася кожны дзень праводзіць там па 4–5 гадзін. Дакладней, у аддзеле будаўніцтва. На яго прыкладзе я павінен быў зрабіць адпаведны алгарытм.

Шмат не буду пра гэта распавядаць, але праз пэўны час я зразумеў, што самая вялікая анархія нараджаецца менавіта там. Так, дзякуючы кібернетыцы, на практыцы ўбачыў, што ў сацыялізму няма перспектыў і ён абавязкова завядзе людзей у тупік.

На жаль, у беларускай эканоміцы сёння адбываецца амаль тое ж самае.

## Эканамічная лінія

Пры размеркаванні (дыплом эканаміста-матэматыка) у мяне было два варыянта. Першы — пайсці працаваць у якую-небудзь «паштовую скрыню» Падольску, дзе жыў мой дзядзька, стрыечны брат з сястрой і дзе было вельмі шмат ваенных заводаў. Але не прыйшлася да спадобы сама атмасфера горада. Нейкая несур'ёзна-пацанская падмаскоўная качагарка. Сталыя мужчыны паводзяць сябе вельмі прымітыўна — па пад'ездах п'юць «чарніла», б'юць адзін аднаму морды... Ніякага духоўнага жыцця.

Таму без ваганняў я абраў Мінск — беларусу заўсёды бліжэй яго радзіма. Размеркаваўся ў навукова-даследчы інстытут эканоміка-матэматычных метадаў планавання пры Дзяржплане БССР. Словам, тое, што для маёй спецыяльнасці і патрэбна. Яны накіравалі заяўку ў МДУ. Я прыехаў сюды працаваць, і адразу, як кажуць, «вызначыўся».

Ехаў з працы ў аўтобусе, а недзе наперадзе сядзеў намеснік дырэктара Леў Паўлавіч Мятліцкі, які да гэтага быў сакратаром гаркаму партыі. 1968 год. Чэхаславацкія падзеі. На той час я ўжо слухаў рознае замежнае радыё і таму некаму «тлумачыў» неафіцыйную кропку гледжання. Назаўтра мяне выклікалі ў кабінет Мятліцкага…

Неўзабаве адбыўся яшчэ адзін вельмі паказальны выпадак. Да нас прыехаў вучоны з Югаславіі, яму зладзілі сустрэчу, але на яе чамусьці не прыйшоў перакладчык. Да іх на той час у нас ставіліся «скрозь зубы», бо канфлікт з Ціта так і не скончыўся.

Мятліцкі пачаў шукаць дапамогу сярод нас. Усе нашы вы-

чоныя — насы ў стол. Я няблага ведаў англійскую мову і цягнуў руку, але ён мяне наўмысна не бачыў. Мабыць, не хацеў, каб у югаслаўскага «рэвізіяніста» быў яшчэ і «дысідэнцкі» перакладчык. Убачыў мяне сам югаслаў, і Мятліцкаму ўжо нічога не заставалася іншага, як папрасіць перакладаць.

Праз некаторы час з-за кватэры я перайшоў у другое ведамства. Дакладней, загадчыкам сектара ў Навукова-даследчы інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, але хутка стала зразумела, што каб хранаметраваць, колькі часу ідзе на дойку кароваў, спецыяліст майго ўзроўню не патрэбны. Гэта здольны зрабіць любы студэнт.

Перайшоў старшым навуковым супрацоўнікам у інстытут будаўніцтва і архітэктуры, дзе стаў займацца адпаведнай эканомікай. Потым прызначылі там загадчыкам лабараторыі, аддзелу, абараніў дысертацыю кандыдата эканамічных навук. Дарэчы, у аспірантуры я вучыўся зноў у Маскве і стаў там экспертам Дзяржбуду СССР.

Прапрацаваў там гадоў 14, а затым перайшоў старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута эканомікі Акадэміі Навук БССР, дзе прапрацаваў больш чым дзесяць гадоў. Да самага распаду СССР.

Потым вучоныя сталі зарабляць капейкі, і я «пайшоў па руках». Першым было акцыянернае таварыства «Суражскія дамы», дзе стаў адным з галоўных акцыянераў і дырэктарам па фінансах. Па сутнасці гэта «правайдарская» фірма. У тым сэнсе, што мы хацелі паўтарыць усё тое, што рабіў у Маскве Лужкоў, — будаваць за бізнэс-грошы нейкія сучасныя забудовы, а тых, хто жыве на тым месцы ў старых дамах, адсяляць у новыя. Мы ж былі павінны ўсё гэта арганізаваць.

Пачатак быў вельмі паспяховы, бо будаваць замест сталінскіх баракаў сучасныя бізнэс-цэнтры хацелі многія. На адзін мы нават знайшлі грошы з аўстрыйскай крэдытнай лініі (47 мільёнаў долараў) і чэшскага падрадчыка. Хацелі замест двух баракаў, што амаль насупраць Музкамеды, пабудаваць шматпавярховы вельмі прыгожы сучасны комплекс. У той час я пазнаёміўся са Станіславам Багданкевічам. Ён даў сваю згоду на размяшчэнне Нацыянальнага банку ў 24-павярховай вежы, якая ўваходзіла ў гэты комплекс.

На жаль, з прыходам новай улады ўсё накрылася медным тазам. Нас адразу пачалі «давіць». Тыя баракі стаяць па гэты дзень…

### Грамадска-палітычная лінія

Па сутнасці «новыя» сталі паводзіць сябе як звычайныя рэйдэры. Да таго перад вачамі быў сумны прыклад фірмы «Пушэ»… Словам, наша таварыства давялося ліквідаваць.

Дарэчы, пра тое, што будзе адбывацца ў беларускай эканоміцы і чаму гэта скончыцца вельмі блага, я напісаў у сваёй кнізе «Пятля папулізму» адразу пасля абрання Лукашэнкі прэзідэнтам. На жаль, тыя прагнозы альбо ўжо збыліся, альбо збываюцца сёння.

Потым лёс звёў мяне з Васілём Шлындзікавым, які першым у Беларусі (яшчэ ў часы Савецкага Саюза) акцыяніраваў сваё прадпрыемства. Ён мяне знайшоў па публікацыях і запрасіў у свой кабінет. З разумным чалавекам мы знайшлі агульную мову вельмі хутка і вырашылі ў межах «Амкадору» стварыць прыватнае кансалтынгавае прадпрыемства, якое б спрыяла развіццю ўсяго канцэрну. Я стаў яго дырэктарам, а потым фактычна падбіў Васіля Міхайлавіча на «вялікую палітыку». Аргумент быў толькі адзін — хто, калі не мы, будзе нешта рабіць у гэтай краіне?

У выніку нашых размоў і ўзнікла ідэя стварыць Грамадзянскую партыю, у якую ўвайшлі даволі значныя асобы розных галінаў жыцця. У большай частцы — інтэлігенцыя і дырэктарат. Многія з іх потым вырашылі сысці, бо такі выбар паставіла перад імі ўлада — альбо працуй, альбо ідзі ў «апазіцыянеры».

Было зразумела, што гэта элітная партыя, і шанцаў заняць высокае месца на бліжэйшых парламенцкіх выбарах у яе даволі няшмат. Таму і ўзнікла ідэя аб'яднаць яе з дэмакратамі Аляксандра Дабравольскага, чыё электаральнае поле было больш шырокім. Добрая ідэя, але ў мяне ўжо тады ўзнікла апасенне, што такая партыя не будзе ліберальнай, і звязана гэта з канкрэтнай асобай. Таму пачаў крыху стрымліваць аб'яднанне, хаця і быў адным з ініцыятараў.

1 красавіка 1995 года ўзнікла Аб'яднаная грамадзянская партыя. І тут, думаю, я зрабіў памылку. Трэба было заставацца адным з намеснікаў, што было абгаворана са Шлындзікавым, а я вырашыў абмежавацца толькі сяброўствам у вышэйшым кіруючым органе — палітсавеце. Кураваў там пытанні эканомікі, але працягвалася гэта нядоўга.

На мой погляд, новая партыя маргіналізавалася і не стала сапраўды ліберальнай. У 2002 годзе я з яе прынцыпова выйшаў. Па гэты дзень ніхто не можа мне растлумачыць, чым яна адрозніваецца ад іншых… Напрыклад, ад БНФ?

Пасля таго, як Васіль Шлындзікаў прайшоў у парламент, я быў галоўным спецыялістам камісіі па эканамічнай палітыцы і рэформам. Пасля разгону парламента стварылі з ім Асацыяцыю садзейнічання развіццю сярэдняга бізнэсу, якая займалася перш за ўсё асветніцкай дзейнасцю. Пасля працаваў саветнікам па эканоміцы Міжнароднай фінансавай карпарацыі, якая ўваходзіць у групу Сусветнага банка. Потым выкладаў у розных навучальных установах.

У мінулым годзе мяне запрасіў у сваю каманду Андрэй Саннікаў, для якога я стварыў эканамічную праграму.

СВЯТА ПІСЬМЕНСТВА

# ТУТ ЖЫЎ І ПРАЦАВАЎ ЯКУБ КОЛАС

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**4 верасня ў Ганцавічах Брэсцкай вобласці прайшоў XVIII Дзень беларускай пісьменнасці. У яго праграме адбыліся шматлікія выставы, прэзентацыі новых выданняў, сустрэчы з беларускімі літаратарамі, паэтычныя чытанні і конкурсы.**







Ужо даўно такія святы падвяргаюцца няшчаднай крытыцы за тое, што бюракратычнымі «высілкамі» добрыя намеры пераўтвараюцца ў парад музычнай і літаратурнай безгустоўнасці, кітчу і псеўдамастацтва. Гэта і атрымала назву сіндрому «Дажынак». Хоць, зразумела, сам дажынычны абрад мае тысячагадовую гісторыю і не можа быць падставай для адмаўлення. Такім гэтае свята зрабілі чыноўнікі, каб як мага больш поўна дагадзіць начальству.

Традыцыйнае свята Дня пісьменства ў Ганцавічах распачалося малебнам за беларускі народ і словамі вітання ад кіраўніцтва краіны і Брэсцкай вобласці. Першым на сцэну падняўся старшыня нацыянальнага аргкамітэту пра правядзенню Дня пісьменства А. Тозік, які адзначыў, што гэтым святкаваннем мы аддаём даніну павагі таленавітым людзям, якія жывуць на Ганцаўшчыне, тым творцам, якія стварылі славу Палескаму краю, узбагацілі яго духоўна. Ён жа зачытаў прывітальнаю тэлеграму ад прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удзельнікам Дня беларускага пісьменства.

Трэба сказаць, што з года ў год беларуская мова з вуснаў беларускіх афіцыйных асобаў гучыць усё больш упэўнена. Відаць, нездарма паэт Яўген Гучок у адным са сталічных тэатраў пры выпадку, пра што стала вядома з публікацый у адной з беларускіх газет, зачытаў А. Тозіку свой верш пра важнасць роднага слова («На гэтай мове уркі не гаворадь, на гэтай мове «Мурку» не пяюць...»).

На роднай мове прамаўлялі таксама старшыня Брэсцкага аблвыканкама К. А. Сумар, старшыні райвыканкама У. Столяр і архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан, які зачытаў пасланне ад мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага экзарха ўсёй Беларусі Філарэта.

Пасля таго, як святкаванне Дня беларускага пісьменства ў Ганцавічах распачалося афіцыйна, у горадзе адбылося адкрыццё Алеі Пісьменства, на якой зафіксаваныя — адлітыя ў метале на адпаведных стэлах — імёны фальклярыстаў і літаратараў, выхадцаў з Ганцаўшчыны: Аляксандра Сержпутоўскага, Алеся Касько, Геогія Марчука, Васіля Праскурава, Міхася Рудкоўскага, Віктара Гардзея і іншых. Гэтыя пісьменнікі і даследчыкі стваралі славу Палескаму краю. А завяршыў гэтую мемарыяльную кампазіцыю, якая, упэўнены, стане візітоўкай Ганцавічаў, цудоўны помнік маладому, рамантычнаму Якубу Коласу, які пачынаў сваю настаўніцкую дзейнасць тут, на Ганцаўшчыне, у вёсцы Люсіна. На адкрыцці помніка прысутнічаў сын Песняра Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч. Помнік аўтарства сяброў Беларускага саюза мастакоў Паўла Герасіменкі і Алесі Грушчанковай (архітэктар Ірына Вайтэнка) сапраўды стаў упрыгажэннем горада, якому не хапала манументальнага атачэння. Цяпер, разам з новымі, адрамантаванымі цэнтральнымі вуліцамі, Алея Пісьменства з помнікам Якубу Коласу стане любімым месцам адпачынку гараджан.

Але не трэба думаць, што свята пісьменства было напоўнена толькі аднымі высокімі па грамадзянскаму гучанню падзеямі. Былі тут і «дажынкаўскія» сімптомы: кірмашы з абавязковымі кітчавымі інсталяцыямі, кшталту бабкі і дзеда за «чаркай і шкваркай» як атрыбутамі беларускага менталітэту. Некаторыя аматары «літаратуры і пісьменства» больш заглядвалі на дно бутэлькі з гарэлкай, чым у кнігі дзяржаўных выдавецтваў, а з імправізаваных сцэн часцяком гучала тое, што завецца квазі-фальклорам і рэстараннай папсой...

І ўсё ж адчувалася, што ганцаўчане ганарацца сваімі каранямі, сваёй адметнай мовай, палескім краем, сваім майстрамі. Таму адмоўнага ў такіх святкаваннях было адчувальна менш, чым у іншых гарадах і мясцовасцях, якія па чарзе становяцца гаспадарамі ці то Дня пісьменства, ці то «Дажынак». Гэта вынік характару палешукоў, якія маюць вялікі гонар за свой край, за сваіх знаных людзей — літаратараў і майстроў. Гэта можна было адчуць і тады, калі на святочную сцэну выходзілі аўтэнтычныя палескія спявачкі ў намітках, якія можна было пабачыць толькі ў энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» ці на канцэртах гурта «UR'IA». Тут жа, на святочных канцэртных пляцоўках, гэтыя песні і ўнікальныя нацыянальныя касцюмы беларусаў Палесся можна было пачуць і ўбачыць, што называецца, «жыўцом». Гараджане і госці Ганцавічаў іх сустракалі надзвычай эмацыйна, з цеплынёй і гонарам!



Тая ж адметнасць панавала і на кірмашы майстроў, які прадставіў шмат унікальных творцаў Палескага краю. Нацыянальныя касцюмы з фондаў Музея народнай творчасці «Бездзежскі фартушок», палескія спевы ад фальклорнага гурта Хатыніцкага сельскага савета, драўляныя скульптуры народнага майстра І. П. Супрунчука з вёскі Цераблічы Столінскага раёна паказвалі і раскрывалі гасцям горада вытокі адметнасці гэтага маляўнічага краю, яго таленавітых і працалюбівых людзей.

Дзень беларускага пісьменства яшчэ раз засведчыў факт, што беларусы — творчы народ, якому да душы добрая кніга, кранальная мелодыя, маляўнічы карунак. Вось толькі асэнсаваць і давесці да ўсяго народа гэты факт напоўніцу можна толькі тады, калі беларускія творцы аб'ядноюць свае высілкі, не зважаючы на тое, да якога творчага саюза яны належаць.

ЦІКАВА

# НАДЗЕЯ НА РОВАРЫ

Яўген БЯЛАСІН

**Надзея існуе ў наўпроставым сэнсе: яна жыве ў Брэсце і даязджае на працу на ровары. Такім чынам, з Надзеяй — гэта як з ордэнам (памятаеце, «Ганна на шыі»). Ганна на шыі, а Надзея на ровары.**

Надзея Ярмішына працуе ў аддзеле замежнай літаратуры Брэсцкай абласной бібліятэкі. Закончыла філалогію Брэсцкага ўніверсітэта, дзе вучыўся Алесь Разанаў. На працу з мікраёна прынцыпова ездзіць на ровары. Кажучы больш дакладна, «аддае перавагу», бо ж выпадае зіма, калі ездзіць забараняе ДАІ, і дажджы…

Чаму? Не толькі і не столькі з-за знаёмства з нямецкай рэчаіснасцю (на працы Надзеі належыць працаваць з літаратурай на нямецкай мове). Больш тут вымога здаровага сэнсу, або гэта нават зварот да ўрокаў «басаногага вясковага дзяцінства», тлумачыць Надзея.

Да жытла каля трох кіламетраў. Ехаць цераз чыгуначныя пераезды… Так што на ровары хутчэй і зручней, кажа Надзея. Нават у аўто парыцца на сонцы ў корку — не лічу гэта суперскім спосабам.

Пытаю, ці думала калісьці малая Надзя, якая ў вёсцы ездзіла на веласіпедзе, што будзе каціць па гораду? У вёсцы веласіпед — нешта крыху іншае, адказвае Надзея. Там гэта звыклы спосаб перамяшчэння, але і забаўка. Для дзятвы. Або ўжо і на танцы на ровары ездзілі.

Чаму беларусы ў гарадах не ездзяць масава на роварах? Бо для іх гэта якраз сімвал вёскі, якой яны цураюцца, разважае брэсцкая раварыстка. Яны купляюць сабе аўто і ездзяць напаказ. Але гэтая тэндэнцыя ровара як стыгмы адыходзіць.

Надзея перасела з аўтобуса на ровар каля трох гадоў таму. Як сама распавядае, «купіла веласіпед на выпадковы заробак. Спытала, ці можна адразу сесці і паехаць. І паехала за мужчынам, бо даўно не ездзіла. Заехала акурат дахаты». Потым у такі самы спосаб навучыла знаёмую, якая, паглядзеўшы на яе экзерсісы, таксама наважылася сесці на двухколавік. «Стала лідарам!» — смяецца Надзея.

Ровар як сродак зносін прагрэсуе тут, нягледзячы на неспрыяльную інфраструктуру. Адна каляжанка Надзі дык наогул прыязджае ў Брэст за 16 кіламетраў. Зусім як у Германіі. Мужчыны ўспрымаюць дам нармальна. Некаторыя махаюць у знак прывітання рукой.

— Раварысты — людзі больш свабодныя ад стэрэатыпаў, — кажа Надзея. — Бо ж ехаць на ровары — гэта кайф. Гэта пачуццё палёту, свабоды, вольнасці. Аўтобус, аўтамабіль — гэта кансервавая бляшанка, там ніякага кантакту з прыродай няма. І нават калі едзеш на працу ў сонца, а назад дождж — дык я люблю дождж. Гэта ж прырода. Яе пацалунак.

Але на ровары ёсць і негатывы. Найгорш з пешаходамі. Апошнім часам ім шмат дазволілі, і цяпер ужо крыху позна вешаць перад «зебрамі» выпіску з Правілаў дарожнага руху, маўляў, перш чым ступіць, упэўніся… Яны сталі пачувацца поўнымі гаспадарамі! Ідуць сабе гуляючы, ні налева не глянуць, ні направа, па мабільніку шчабечуць. Рэакцыі могуць быць панічныя. Езджу хутка, дык нядаўна адна дзяўчына гадоў шаснаццаці, пабачыўшы мяне, раптам села на тратуар.

Я сам не злажу з ровара, таму мяне асабліва цікавяць дачыненні з ДАІ.

— У Брэсце ні разу не была ў ДТЗ, не падала з ровара, — кажа Надзея. — Калі вучылася ездзіць у дзяцінстве, тады так. Ну дый тады я ездзіла іначай…. «Без рук», з багажніка, на педалі… А з аўтаінспекцыяй… Я найперш вывучыла правілы дарожнага руху. Толькі потым выкаціла на вуліцу. Аднойчы мяне затрымаў інспектар. Па шматпалоснай дарозе паехала на скрыжаванне, замест таго каб перавесці ў руках. Машын там не было, але спыніў, ветліва так патлумачыў, паказаў у Правілах і выпісаў невялікі штраф, пару тысяч. Я і не супраць.

Не скардзіцца брэсцкая раварыстка і на кіроўцаў аўтатранспарту. Не прыцікаюць да абочыны, ставяцца паважліва (ці паблажліва? — думаю, бо ў Брэсце шмат «дальнабойшчыкаў», і нядаўна з Брэстнэту даведаўся, што тыя завуць веласіпедыстаў «хрусцікамі»).

Нават кепскія брэсцкія дарогі Надзеі пасуюць. У горадзе толькі 5 кіламетраў веласцежак каля нядаўна збудаванага Веславальнага канала, у цэнтры горада за нядаўні двухгадовы капітальны рамонт не зрабілі ніводнай. Больш за тое, гарсавет прыняў адмысловае рашэнне не ладзіць у цэнтры веласцежак наогул, хоць што там ладзіць: раздзялі фарбай шырокі тратуар і адштампуй фігуркі — на адной палове пешахода, на другой раварыста.

Звыклая да, скажам так, не надта роўных дарог дзяцінства, Надзея не наракае на хай сабе шчарбаты, але ўсё ж асфальт брэсцкай вуліцы Янкі (у мясцовым фальклоры — Ямкі) Купалы, а проста круціць педалі. І хрысціянская ціхамірнасць тут бадай што ёсць. Бо Надзея Ярмішына верыць у пана Бога, належыць да грэка-каталіцкай парафіі імя старадаўніх патронаў у Брэсце Пятра і Андрэя.



Фота аўтара

Нават свае тэхнічныя праблемы спадарыня Надзея вырашае ў царкве. Два маладзёны там ездзяць на роварах, вось яны і рамантуюць, калі што.

Але ў Германію на ровары Надзея не збіраецца. Хоць у Брэсце такія прыклады ёсць. У прыватнасці, Георгій Руцкі, сацыял-дэмакрат, звольнены калісь за «няправільны» ўдзел у выбарах з працы, мацуе дух велападарожжамі. Мае на рахунку ўжо паездкі ў Львоў і Санкт-Пецярбург. На звычайным дарожным велагоне, дзедаўскай яшчэ мадэлі.

Мы пяць нейкіх хвілін гаворым пра Германію. Калісьці як прыхільнік зялёнай ідэі я адмыслова даследаваў «эпіцэнтры» роварштыны. Адзін з іх у Мюнстэры, роўнавялікім Брэсту нямецкім горадзе. На кожнага жыхара там прыпадае метр веласцежкі, 5 кіламетраў даўжыні мае адна толькі кальцавая веласцежка вакол цэнтра, і агулам у горадзе 700 тысяч ровараў — па два з паловай на нос.

— Так, гасцявая настаўніца з 7-й школы Кэтрын Краўс, — спасылаецца Надзея, — здзіўлялася, чаму пры кароткіх адлегласцях беларусы не ездзяць на роварах. Але і ў нас раварыстаў большае. Цэлая купа на стаянцы каля «Газаапарата» стаіць, кажа яна. А мне свой дазволілі ставіць на працы ў закутак. Іначай могуць скрасці.

Калі рана ці позна адкрыецца малы памежны рух з Польшчай, Надзея Ярмішына гатовая рушыць у чатырохкіламетровую вандроўку «да Тарэсполю», а можа нават і далей, у Кастамлоты. Або ў другі бок, на Бяла-Падляску ці Беласток. Гледзячы, якая група падбярэцца, якога кшталту цікавасць.

— Адзін з Папаў рымскіх сказаў: «Не бойцеся», — тлумачыць Надзея. — У нейкім сэнсе, гэта ўніверсальная формула. Асабліва для нас, беларусаў. Не трэба баяцца новага, асабліва калі новае — гэта добрае старое, на якое раптам вырашылі махнуць рукою. Пераехалі ў гарады і… зблыталі веласіпед і карову.

КАНЦЭРТ

# «RAHIS» ЗЛАДЗІЎ КВАТЭРНІК

Мікіта БРОЎКА

**2 верасня гурт «Rahis» даў доўгачаканы канцэрт ва ўтульнай кватэры на захадзе Мінску.**



Больш за дзесяць гадоў таму два звычайных хлопца з прыродазнаўчага факультэта педагагічнага ўніверсітэта пачалі пісаць песні і спяваць разам. Неўзабаве ў гурта з'явілася назва, а імправізаваныя выступы на калідорах універсітэта перамясціліся на больш сур'ёзныя пляцоўкі.

У 2010 годзе, будучы ўжо дасведчанымі музыкамі, удзельнікі гурта «Rahis» запісалі свой дэбютны альбом пад назвай «Сшытак тэкстамі ў малюнках». У адрозненні ад звычайных выступаў і старых запісаў альбом стаў электрычным, што шмат каго прымусіла паглядзець на гурт па-іншаму. Зараз жа, пасля невялікага перапынку ў канцэртнай дзейнасці, хлопцы вырашылі зладзіць кватэрнік.

У сусветным маштабе кватэрнік — з'ява ўнікальная. У савецкі час музыкі і паэты, чыя творчасць разыходзілася з афіцыйнай ідэалогіяй, не мелі магчымасці выступаць на вялікай сцэне. Таму творцы і іх прыхільнікі збіраліся на звычайных кватэрах, дзе ва ўтульнай хатняй атмасферы музыкі спявалі песні, паэты чыталі вершы, а межы паміж выступоўцамі і гледачамі незаўважна сціраліся. І нават зараз, калі ўсё стала больш-менш ліберальна, а забароны кранаюцца толькі невялічкага спісу вядомы выканаўцаў, кватэрнікі не зніклі.

У адрозненне ад вялікіх канцэртаў, на кватэрніках пануе ўтульная хатняя атмасфера, дзе сціраюцца межы паміж выступоўцамі і аўдыторыяй, а музыкі паўстаюць не толькі як выканаўцы, але і як людзі.

На канцэрце ва ўтульнай атмасферы пры свечке свечак лідары гурта Зміцер Язвінскі і Дзяніс Філіпенка выканалі ледзь не ўсе вядомыя песні, а таксама падзяліліся гісторыяй стварэння некаторых сваіх песень і адказалі на пытанні слухачоў. На кватэрнік змаглі патрапіць не ўсе жадаючыя — невялікі пакой кватэры ў якім адбываўся выступ, быў запоўнены цалкам, а некаторая колькасць слухачоў назірала за выступам суседніх пакояў. Напрыканцы канцэрту па просьбах аўдыторыі гурт выканаў песню «Хлопец», якая была напісаная падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 года. Студыйны электрычны варыянт гэтай песні пабачыў свет якраз перад апошнімі выбарамі, што было вельмі дарэчы — пасля яе праслухоўвання заставацца ў баку ад таго, што адбываецца ў краіне, проста немагчыма.

Зараз у бліжэйшых планах гурта — запіс новага альбома, які ўбачыць свет у наступным годзе. У яго ўвойдуць песні, якія па розных прычынах не былі запісаны раней, а таксама некалькі новых песень.

Назва будучага альбома пакуль не вядомая.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 947

Падпісана да друку 09.09.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.